Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

293 (6872) | 20 снежня 1940 г., пятніца | ЦАНА 10 КАП.

За работу, таварышы дэпутаты!

Что ў «Звяздзе» апублікаваны выні-
выбраў у мясцовыя Советы дэпутатаў
цоўных у заходніх абласцях нашай
публікі. Гэтыя вынікі з'яўляюцца
гаржаством социялістычнай дэма-
сведчаннем непераможнасці магут-
лінскага блока комуністаў і бес-
ных.

Брапавіцкай, Беластоцкай, Брэсц-
Рейскай і Пінскай абласцях па
у абласныя советы прыняла
галасаванні 99,62 проц. агульнай
і выбаршчыкаў. За кандыдатаў
ста блока комуністаў і беспар-
галасавала 99,01 проц. удзельні-
ны у галасаванні. Па 98 раёнах
рах у раённыя советы прымала
галасаванні 99,68 проц. агульнай
і выбаршчыкаў. За кандыдатаў
муністаў і беспартыйных галаса-
970 проц. прыняўшых удзел у га-
. Па 43 гарадах па выбарах
кія советы прыняла ўдзел у га-
99,51 проц. агульнай колькасці
рыкаў. За кандыдатаў блока ко-
і беспартыйных галасавала 98,85
ыняўшых удзел у галасаванні.
173 сельсоветах і паселішчах
рах у сельскія і пасялковыя со-
няла ўдзел у галасаванні 99,72
гульнай колькасці выбаршчыкаў.
кандыдатаў сталінскага блока комуні-
і беспартыйных галасавала 97,98
ыняўшых удзел у галасаванні.

у якой краіне свету, апрача
сторыя чалавецтва ведае такое
-палітычнае адзінства народа?

ў нашай краіне, дзе партыя
Сталіна, асабіста вялікі Сталін
клапоцяцца, каб кожны грама-
рыстаўся вялікімі правамі, узако-
талінскай Канстытуцыяй, магчы-
адзінства народа, такая згурта-
вакол сваёй партыі, свайго ўрада.

разная дэмакратыя ў лепшыя
чы не ведала і не ведае нічога
. У Злучаных Штатах Амерыкі
краіне хвалёпага «дэмакратыз-
у выбарах прэзідэнта ў 1940 го-
яла ўдзел толькі 62 проц. меў-
ва голасу. Такава рэчаіснасць
у капіталістычных краінах.

месяцаў совецкай улады ў за-
бласцях нашай рэспублікі пад
вам партыі Леніна—Сталіна пе-
ьна пераўтварыліся гарады і вёс-
навальна пераўтварыўся прапоў-
зек, раней прыгнечаны і зацка-
зворотна знішчана капіталістыч-
лаатацыя, алышло ў нябыт на-
лае прыгнечанне, бяспраўе і
народных мас. Поўным ходам
лі абноўленыя і рэканструіраваны
прыемствы. Дзесяткі мільёнаў
клала совецкая ўлада ў будаў-
овых прадпрыемстваў.

тысяч гектараў памешчыцкіх і
тскіх зямель, шматлікі жывы і
нвентар, пераданы сялянам у
карыстанне. Сельская гаспадарка
тэхнікай. Ужо больш 100
страна на тэрыторыі заходніх аб-
З кожным днём сяляне-алнаасоб-
ніканаўшыся ў перавазе калгаснай
павялічваюць ралы калгаснікаў.
ым садам расквітнела нацыянальн-
форме і социялістычная па зместу
народаў вызваленых абласцей.
новыя тэатры, школы, клубы,
цуюць на мовах народаў, насяе-
заходнія абласці нашай рэспуб-

якая пры панаванні польскіх
каў і капіталістаў была непа-
знясільваючай, стала на совецкіх
прыемствах справай чэсці, доблесці і
. Значна выраслі рады стаханаў-
паказваюць узоры социялістыч-
пры. Стаханаўцы сваім прыкладам
ьюць масы, натхняюць іх на твор-
шпу, на ўмацаванне эканамічнай
ей магутнасці сваёй радзімы.

ныя вызваленых абласцей за 15
совецкай улады алчылі ўсю ве-
ня совецкага грамадзяніна, зажы-
ва і радасна. Вось чаму яны 15
прышлі арганізавана і дружна да
урнаў і аддалі свае галасы за
каў сталінскага блока комуністаў
стыйных.

выя Советы дэпутатаў працоўных
Гэтыя выбары завяршылі пера-
рганізаваў совецкай улады на аснове
кай Канстытуцыі ў новых аблас-
шай рэспублікі. Да кіраўніцтва
і органамі ўлады прышлі тыся-
ей з гушчы народных мас. У абласныя советы выбрана 367 дэпутатаў, у раённыя советы — 4.243 дэпутаты, у гарадскія советы — 2.519 дэпутатаў, у сельскія і пасялковыя советы — 32.945 дэпутатаў. Раней прыгнечаныя, бяспраўныя, пазбаўленыя чалавечага дастоінства людзі зараз прышлі да кіраўніцтва мясцовымі советамі. Выбраныя дэпутаты з'яўляюцца сапраўднымі народнымі прадстаўнікамі, перадавымі людзьмі, якія самааддана вялі барацьбу з польскімі памешчыкамі і капіталістамі ў перыяд іх панавання, а цяпер правялі сябе ў барацьбе за ўстанаўленне новага жыцця.

Перад выбраннікамі народа — вялікае поле дзейнасці, адказныя задачы. Мы жывем у абстаноўцы пажару другой імперыялістычнай вайны. Совецкі народ дзякуючы мудрай сталінскай знешняй палітыцы нашага ўрада карыстаецца мірнай працай, не ведае жахаў вайны. Але сучасная міжнародная абстаноўка вельмі багата рознымі нечакапасцямі. Мы абавязаны і ў далейшым мацаваць эканамічную і ваенную магутнасць краіны, магутнасць Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Гэта дасягаецца чэснай працай кожнага на сваім участку.

Советы павінны яшчэ больш энергічна працаваць над развіццём прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарта. Чым больш па колькасці і лепш па якасці прадукцыі будуць выпускаць нашы заводы, фабрыкі, наша сельская гаспадарка, тым больш у нас будзе танкаў, самалётаў, гармат і іншых відаў узбраення, тым непрыступней будзе наша краіна для ворагаў.

Вялікае месца ў рабоце советаў павінны заняць клопаты аб задавальненні культурна-бытавых патрабаванняў насельніцтва, аб далейшым дабрабыце гарадоў, мястэчак і вёсак. Польскія капіталісты і памешчыкі не лічыліся з запатрабаваннямі народных мас. Іх палітыка была накіравана на забеспячэнне дабрабыту буржуазіі, памешчыкаў, афіцэраў і гандляроў. Працоўныя-ж жылі ў выключна дрэнных умовах. Советы павінны правесці вялікую работу па ўпарадкаванню гарадоў і вёсак, павінны чула прыслухоўвацца да ўсіх заяў працоўных.

Варожыя элементы з асколкаў буржуазных партый былой панскай Польшчы паспрабуюць перашкодзіць вызваленаму народу ў яго паспяховым будаўніцтве социялізма. Советы дэпутатаў працоўных павінны быць заўсёды пільнымі, своечасова выкрываць спробы ворагаў шкодзіць інтарэсам социялістычнай дзяржавы. Дэпутаты павінны заўсёды быць на варце рэволюцыйнай законнасці, выхоўваць у насельніцтва пачуццё павагі да совецкіх законаў, патрабаваць ад кожнага грамадзяніна няўхільнага выканання сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

Вялікія задачы стаяць перад советамі ў галіне культурнага будаўніцтва.

Дэпутаты, аднадушна выбраныя народам, ва ўсёй сваёй дзейнасці павінны апірацца на велізарны актыў выбаршчыкаў, трымаць цесную сувязь з сваімі выбаршчыкамі, памятаючы, што дэпутат — слуга народа.

Таварыш Сталін у сваім выступленні на перадвыбарным сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай округі гор. Масквы 11 снежня 1937 года сказаў:

«Выбаршчыкі, народ павінны патрабаваць ад сваіх дэпутатаў, каб яны аставаліся на вышыні сваіх задач, каб яны ў сваёй рабоце не спускаліся да ўзроўню палітычных абываталяў, каб яны аставаліся на пасту палітычных дзеячоў ленінскага тыпу, каб яны былі такімі-ж яснымі і пэўнымі дзеячамі, як Ленін, каб яны былі такімі-ж бясстрашнымі ў баі і бязлітаснымі да ворагаў народа, якім быў Ленін, каб яны былі свабодны ад усякай панікі, ад усякага падабенства панікі, калі справа пачынае ўскладняцца і на гарызонце вырысоўваецца якая-небудзь небяспека, каб яны былі таксама свабодны ад усякага падабенства панікі, як быў свабодны Ленін, каб яны былі таксама мудрыя і непаспешлівы пры вырашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўлік усіх плюсаў і мінусаў, якім быў Ленін, каб яны былі таксама праўдзівы і чэсны, якім быў Ленін, каб яны таксама любілі свой народ, як любіў яго Ленін».

Няма больш пачотнага абавязку, як выхоўваць у сабе дзяржаўнага дзеяча ленінска-сталінскага тыпу. Няма больш пачотнага абавязку, чым служыць народу.

За работу, таварышы дэпутаты!

У Мінскім гаркоме КП(б)Б

спаўняецца XXIII гадавіна
ПУ—НКВД. Бюро гарадскога ка-
П(б)Б у прынятым рашэнні аба-
се райкомы партыі Мінска пра-
снежня раённыя сходы партый-
мсамольскага і профсаюзнага ак-
высвечаныя гэтай знамянальнай

адпрыемствах і ва ўстановах, у
часцях будуць правезены лакла-
таркі аб гераічнай барацьбе со-
вецкай разведкі з ворагамі рабочага клаcа, аб ролі партыі Леніна—Сталіна ў стварэнні гэтага баявога органа пролетарскай дыктатуры. У бібліятэках, чырвоных кутках арганізоўваюцца выстаўкі літаратуры, фотаздымкаў, аллюстроўваючыя слаўнае жыццё і рэволюцыйную дзейнасць палкіх большэвікоў — чэкістаў тт. Дзержынскага і Менжынскага.

(БЕЛТА).

Выстаўка, прысвечаная 15-годдзю XIV з'езда ВКП(б)

У
гальнай зале бібліятэкі імені Гор-
ом Урала БССР) адкрылася літа-
выстаўка, прысвечаная 15-год-
з'езда ВКП(б). На ёй прадстаў-
кніг, фотаздымкаў, аллюстроўваю-
оту гістарычнага XIV з'езда пар-
тыі—з'езда індустрыялізацыі. Сярод іх—работы таварыша Сталіна «Аб Леніне», «Пытанні ленінізма», «Палітычная справаздача XIV з'езда ВКП(б)», «Выбраныя артыкулы і прамовы С. М. Кірава» і інш.

(БЕЛТА).

УСІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ ВКП(б)

Цэнтральны Камітэт партыі пастанавіў склікаць на 15 лютага 1941 года XVIII Усесаюзную канферэнцыю ВКП(б).

ПАРАДАК ДНЯ XVIII УСЕСАЮЗНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ:

1. Аб рабоце партыйных арганізацый у галіне прамысловасці і транспарта.
2. Арганізацыйныя пытанні.

НОРМЫ ПРАДСТАЎНІЦТВА І ПАРАДАК ВЫБАРАЎ:

1. На падставе § 37 Статута Партыі кіраваццa наступнымі нормамі прадстаўніцтва для выбараў дэлегатаў на XVIII Усесаюзную партыйную канферэнцыю:

а) абласныя, краявыя, рэспубліканскія партыйныя арганізацыі, якія маюць звыш 10.000 членаў партыі, пасылаюць аднаго дэлегата з рашаючым голасам на кожныя 10.000 членаў партыі;

б) абласныя, краявыя, рэспубліканскія партыйныя арганізацыі, якія маюць менш 10.000 членаў партыі, пасылаюць аднаго дэлегата з рашаючым голасам.

2. Па РСФСР, Украінскай ССР і Беларускай ССР дэлегаты на XVIII Усесаюзную партыйную канферэнцыю выбіраюцца ад абласцей, краёў і аўтаномных рэспублік на пленумах Абкомаў і Крайкомаў партыі, а па іншых саюзных рэспубліках — ад рэспублік на пленумах ЦК Компартый.

3. У сувязі з тым, што галоўным пытаннем парадку дня канферэнцыі з'яўляецца пытанне аб рабоце партарганізацыі ў галіне прамысловасці і транспарта—прадастаўляецца дадаткова па аднаму мандату з рашаючым голасам наступным гаркомам партыі, прадстаўляючым прамысловыя цэнтры:

1. Молатаўскаму	Архангельскай обл.
2. Беларэцкаму	Башкірскай АССР
3. Ішымбаеўскаму	« »
4. Беластоцкаму	Беларускай ССР
5. Віцебскаму	« »
6. Гомельскаму	« »
7. Магілеўскаму	« »
8. Ліпецкаму	Варонежскай обл.
9. Дзержынскаму	Горкаўскай обл.
10. Балахнінскаму	» »
11. Выксунскаму	» »
12. Мурамскаму	» »
13. Паўлаўскаму	» »
14. Чыятурскаму	Грузінскай ССР
15. Кутаіскаму	» »
16. Батумскаму	» »
17. Каўроўскаму	Іванаўскай обл.
18. Владзімірскаму	» »
19. Шуйскаму	» »
20. Кінешэмскаму	» »
21. Іркуцкаму	Іркуцкай обл.
22. Чэрэмхоўскаму	» »
23. Карагандзінскаму	Казахскай ССР
24. Рыдзерскаму	» »
25. Балхашскаму	» »
26. Вышневалоцкаму	Калінінскай обл.
27. Петразаводскаму	Карэла-Фінскай ССР
28. Вінцурскаму (Выбаргскаму)	» »
29. Фрунзенскаму	Кіргізскай ССР
30. Кіраўскаму	Кіраўскай обл.
31. Новарасійскаму	Краснадарскага края
32. Армавірскаму	» »
33. Краснаярскаму	Краснаярскага края
34. Керчэнскаму	Крымскай АССР
35. Севастопальскаму	» »
36. Ульянаўскаму	Куйбышэўскай обл.
37. Сызранскаму	» »
38. Чапаеўскаму	» »
39. Рыжскаму	Латвійскай ССР
40. Лепайскаму	» »
41. Волхаўскаму	Ленінградскай обл.
42. Пскоўскаму	» »
43. Ноўгарадскаму	» »
44. Каунаскаму	Літоўскай ССР
45. Вільнюскаму	» »
46. Кішанёўскаму	Малдаўскай ССР
47. Беразнякоўскаму	Молатаўскай обл.
48. Кізелоўскаму	» »
49. Краснакамскаму	» »
50. Лысьвенскаму	» »
51. Салікамскаму	» »
52. Чусавскому	» »
53. Каломенскаму	Маскоўскай обл.
54. Серпухаўскаму	» »
55. Нагінскаму	» »
56. Палольскаму	» »
57. Арэхава-Зуеўскаму	» »
58. Егор'еўскаму	» »
59. Электрастальскаму	» »
60. Клінскаму	» »
61. Краснагорскаму	» »
62. Бунцёўскаму	» »
63. Мыцішчанскаму	» »
64. Ухтомскаму	» »
65. Хімкінскаму	» »
66. Шчалкоўскаму	« »
67. Мурманскаму	Мурманскай обл.
68. Кемераўскаму	Новасібірскай обл.
69. Пракоп'еўскаму	« »
70. Сталінскаму	« »
71. Ленінск-Кузнецкаму	« »
72. Анжэра-Суджэнскаму	« »
73. Томскаму	« »
74. Цюменьскаму	Омскай обл.
75. Орджанікідзеградскаму	Орлоўскай обл.
76. Бранскаму	« »
77. Клінцоўскаму	« »
78. Шахцінскаму	Растоўскай обл.
79. Таганрогскаму	« »
80. Новачэркаскаму	« »
81. Вольскаму	Саратаўскай обл.
82. Тагільскаму	Свердлоўскай обл.
83. Краснаўральскаму	« »
84. Рэўдзінскаму	« »
85. Сероўскаму	» »
86. Ярцэўскаму	Смаленскай обл.
87. Астраханскаму	Сталінградскай обл.
88. Мічурынскаму	Тамбоўскай обл.
89. Сталінабадскаму	Таджыкскай ССР
90. Сталінагорскаму	Тульскай обл.
91. Калужскаму	« »
92. Ашхабадскаму	Туркменскай ССР
93. Іжэўскаму	Удмурцкай АССР
94. Самаркандскаму	Узбекскай ССР
95. Сергоўскаму	Варашылаўградскай обл.
96. Варашылаўскаму	« »
97. Красналуцкаму	« »
98. Днепрадзержынскаму	Днепрапятроўскай обл.
99. Крыварожскаму	« »
100. Нікопальскаму	« »
101. Мелітопальскаму	Запарожскай обл.
102. Львоўскаму	Львоўскай обл.
103. Нікалаеўскаму	Нікалаеўскай обл.
104. Херсонскаму	« »
105. Крэменчугскаму	Палтаўскай обл.
106. Сумскаму	Сумскай обл.
107. Макееўскаму	Сталінскай обл.
108. Крэматорскаму	« »
109. Горлаўскаму	« »
110. Арцёмаўскаму	« »
111. Канстанцінаўскаму	« »
112. Орджанікідзеўскаму	« »
113. Марыупальскаму	« »
114. Славянскаму	« »
115. Чысцякоўскаму	« »
116. Комсамольскаму	Хабараўскага края.
117. Магнітагорскаму	Чэлябінскай обл.
118. Златаустаўскаму	« »
119. Каменск-Уральскаму	« »
120. Грозненскаму	Чэчэна-Інгушскай АССР
121. Орскаму	Чкалаўскай обл.
122. Талінскаму	Эстонскай ССР
123. Нарвскаму	» »
124. Кастрамскому	Яраслаўскай обл.
125. Рыбінскаму	» »

4. Прадастаўляецца дадаткова па аднаму мандату з рашаючым голасам наступным вузлавым партарганізацыям на чыгуначным транспарце:

1. Батайскаму	Чыгункі ім. Варашылава.
2. Батракскаму	Чыгункі ім. Куйбышэва.
3. Беластоцкаму	Беластоцкай чыгункі.
4. Бранскаму II	Маск. Кіеўскай чыгункі
5. Вільнюскаму	Літоўскай чыгункі.
6. Владзівастоцкаму	Прыморскай чыгункі.
7. Вспольінскаму	Яраслаўскай чыгункі.
8. Гомельскаму	Беларускай чыгункі.
9. Горкі-Сартыровачнаму	Горкаўскай чыгункі.
10. Дэбальцэва-Сартыровачнаму	Паўночна-Данецкай чыгункі.
11. Інскаму	Томскай чыгункі.
12. Кочэтаўскаму	Ленінскай чыгункі.
13. Красналіманскаму	Паўночна-Данецкай чыгункі.
14. Ленінградскаму (Ленінград-Пасажырскі)	Окцябрскай чыгункі.
15. Львоўскаму	Львоўскай чыгункі.
16. Масква-Сартыровачнаму	Ленінскай чыгункі.
17. Ніжне-Днепроўскаму	Сталінскай чыгункі.
18. Аршанскаму	Заходняй чыгункі.
19. Оснавянскаму	Паўднёвай чыгункі.
20. Петразаводскаму	Кіраўскай чыгункі.
21. Петрапаўлаўскаму	Омскай чыгункі.
22. Рыжскаму	Латвійскай чыгункі.
23. Рузаеўскаму	Пензенскай чыгункі.
24. Свердлоўск-Сартыровачнаму	Чыгункі ім. Кагановіча.
25. Талінскаму	Эстонскай чыгункі.
26. Тбіліскаму	Чыгункі ім. Берыя.
27. Тульскаму	Чыгункі ім. Дзержынскага.
28. Узлаўскаму	Маск.-Данбаскай чыгункі.
29. Чэлябінскаму	Паўднёва-Уральскай чыгункі.
30. Ясінавацкаму	Паўднёва-Данецкай чыгункі.

5. Прадастаўляецца дадаткова па аднаму мандату з рашаючым голасам партарганізацыям наступных партоў марскога флота:

1. Архангельскаму	8. Мурманскаму
2. Бакінскаму	9. Новарасійскаму
3. Батумскаму	10. Одэскаму
4. Владзівастоцкаму	11. Пацыйскаму
5. Ленінградскаму	12. Рыжскаму
6. Лепайскаму	13. Талінскаму
7. Марыупальскаму	

6. Прадастаўляецца дадаткова па аднаму мандату з рашаючым голасам партарганізацыям наступных партоў рачнога флота:

1. Архангельскаму	8. Молатаўскаму
2. Астраханскаму	9. Маскоўскаму
3. Горкаўскаму	10. Новасібірскаму
4. Ізмаільскаму	11. Растоўскаму
5. Кіеўскаму	12. Рыбінскаму
6. Краснаярскаму	13. Сталінградскаму
7. Ленінградскаму	14. Хабараўскаму

7. Выбары дэлегатаў ад гаркомаў партыі, вузлавых партарганізацый чыгуначнага транспарта і ад партарганізацый партоў марскога і рачнога флотаў праводзяцца на пленумах Абкомаў, Крайкомаў, ЦК Компартый Саюзных Рэспублік.

8. Комуністы, якія знаходзяцца у партыйных арганізацыях Чырвонай Арміі, Ваенна-Марскога Флота і часцей НКВД, удзельнічаюць у выбарах дэлегатаў на XVIII Усесаюзную партыйную канферэнцыю на пленумах Абкомаў, Крайкомаў, ЦК Компартый Саюзных рэспублік на агульных падставах, як частка агульнапартыйных арганізацый.

Сакратар ЦК ВКП(б) І. СТАЛІН.

ТЭЛЕГРАМЫ

Прыём рэйхсканцлерам Германіі п. Гітлерам паўпрэда СССР у Германіі тав. В. Г. Дэканозава

БЕРЛІН, 19 снежня. (ТАСС). 19 снежня ў новай імперскай канцылярыі рэйхсканцлер Германіі п. Гітлер у прысутнасці міністра замежных спраў Германіі п. фон Рыбентропа прыняў паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Германіі тав. В. Г. Дэканозава, уручыўшага свае верыцельныя граматы. Тав. В. Г. Дэканозаў прадставіў п. Гітлеру адказных работнікаў паўпрэдства СССР у Германіі. Атрад асабовай аховы п. Гітлера аказаў тав. В. Г. Дэканозаву воінскія пашаны як пры яго прыбыцці, так і пры ад'ездзе.

Паведамленне швейцарскага генеральнага штаба

БЕРЛІН, 19 снежня. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае з Берна паведамленне швейцарскага генеральнага штаба, у якім гаворыцца, што ў ноч на 19 снежня было некалькі выпадкаў пералёту замежнымі самалётамі тэрыторыі Швейцарыі з боку Юры ў напрамку на паўднёвы ўсход. У некалькіх пунктах швейцарская зенітная артылерыя адкрыла па самалётах агонь.

ВОДГУКІ У ЗША НА ПРАПАНОВУ РУЗВЕЛЬТА

НЬЮ-ЙОРК, 19 снежня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Юнайтэд Прэс, сярод членаў кангрэса ёсць рознагалоссі па пытанню аб прапанове Рузвельта прадаставіць Англіі ў арэнду або ў пазыку ўзбраенне. Стороннікі максімальнай дапамогі Англіі адабраюць прапанову, іншыя заяўляюць, што выкажуцца за гэтую прапанову, калі яна не будзе перашкаджаць ажыццяўленню амерыканскай праграмы ўзбраенняў. Праціўнікі дапамогі Англіі заяўляюць, што прапанова Рузвельта прадстаўляе сабой спробу абыйсці закон Джансона і закон аб нейтралітэце. Большасць членаў кангрэса адмаўляюцца каментыраваць прапанову Рузвельта.

Як указвае агенцтва Ассошыэйтэд Прэс, у аўтарытэтных кругах заяўляюць, што прапанаваная Рузвельтам праграма прадугледжвае перадачу Англіі ў пазыку або ў арэнду ваенных матэрыялаў на суму не менш 2,5 мільярда долараў, апрача ўжо заказанага Англіяй узбраення на 2 млрд. долараў. «Нью-Йорк геральд трыбюн» падтрымлівае прапанову Рузвельта, называючы яе «рэальным крокам да прызнання сапраўднага становішча рэчаў».

Англа-іспанскія адносіны

ЛОНДАН, 19 снежня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, у палаце абшчын на запытанні аб англа-іспанскіх адносінах намеснік міністра замежных спраў Батлер паведаміў, што англійскі ўрад атрымаў адказ на свой пратэст. Тым не менш іспанскаму ўраду зноў зроблены «самыя рашучыя прадстаўленні». На пытанне аб збудаванні ўмацаванняў у Танжэры Батлер адказаў, што, па запэўненню іспанскага міністра замежных спраў, у міжнароднай зоне Танжэр не будуць будавацца ўмацаванні пастаяннага тыпу.

Палітычная стачка ў Індыі

КАБУЛ, 19 снежня. (ТАСС). Як паведамляе індыйская газета «Трыбюн», у Нагпуры (цэнтральныя правінцыі) пачалася палітычная стачка, у якой удзельнічаюць 17 тысяч рабочых. Стачка адбываецца ў знак пратэста супроць арышту старшыні нагпурскага профсаюза тэкстыльшчыкаў Руікара. Апрача таго, у Нагпурскім раёне бастуюць 10 тысяч рабочых вугальнай прамысловасці, пратэстуючых супроць незаконных выдалёў з заработнай платы.

Адстаўка румынскага міністра замежных спраў

БУХАРЭСТ, 19 снежня. (ТАСС). Як паведамляе румынскае тэлеграфнае агенцтва, кіраўніцтва румынскім міністэрствам замежных спраў часова ўзяў на сябе прэм'ер-міністр генерал Антанеску. Агенцтва ўказвае, што былому міністру замежных спраў Міхаілу Стурдза будзе даручан другі пост.

Абмен насельніцтвам паміж Румыніяй і Балгарыяй

БУХАРЭСТ, 19 снежня. (ТАСС). Згодна падпісанага 17 снежня ў Крайове пагаднення, работы камісіі па абмену насельніцтвам паміж Румыніяй і Балгарыяй закончаны. Газета «Кувынтул» паведамляе, што пакуль з Румыніі перасялілася ў Балгарыю 60 тысяч балгар. У Румынію з Паўднёвай Дабруджы перасялілася 110 тысяч румын.

РУЦІ ВЫБРАН ПРЭЗІДЭНТАМ ФІНЛЯНДСКАЙ РЭСПУБЛІКІ

ХЕЛЬСІНКІ, 19 снежня. (ТАСС). Фінляндскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што прэзідэнтам Фінляндскай рэспублікі выбран цяперашні прэм'ер-міністр Руці.

СМЕРЦЬ КАЛІО

ХЕЛЬСІНКІ, 19 снежня. (ТАСС). Як паведамляе фінляндскае тэлеграфнае агенцтва, сёння памёр ад разрыву сэрца былы фінляндскі прэзідэнт Каліо.

Партыйнае жыццё

Аб партыйных даручэннях і іх выкананні

12 гадзін дня. У цэху моталапрыгоў завода імені Чкалава абедзены перапынак. Агітатар комуніст тав. Шарафановіч, сабраўшы вакол сябе рабочых, праводзіць гутарку. Тэма гутаркі—міжнароднае становішча — зацікавіла рабочых. Яны з увагай слухаюць агітатара, стараюцца нічога не ўпусціць, усё запомніць. Агітатар гаворыць не спяшаючыся, ясна і пераканаўча.

Тав. Шарафановіча ведаюць на заводзе не толькі як лепшага майстра, але і як выдатнага агітатара. Ён часта праводзіць гутаркі з рабочымі свайго цэха, чытае ім газеты, расказвае аб многіх міжнародных навінах, аб жыцці нашай краіны. Сваю агітацыйную работу тав. Шарафановіч цесна спалучае з канкрэтнымі задачамі завода, цэха.

Рабочыя любяць і паважаюць свайго агітатара-комуніста, з усімі незразумелымі пытаннямі накіроўваюцца да яго. І кожны раз атрымліваюць вычарпальныя адказы.

Такіх агітатараў, як т. Шарафановіч, на заводзе нямала. Тут большасць комуністаў упягнута ў актыўнае партыйнае і вытворчае жыццё. Адны маюць пастаянныя даручэнні, другія перыядычныя.

За выкананнем даручэнняў партыйнае бюро строга сочыць.

— У практыцы нашай работы, — расказвае сакратар партбюро тав. Капцель,— яшчэ не было ні аднаго выпадку, каб комуніст не выканаў партыйнага даручэння.

Член партыі тав. Вепраў не так даўно атрымаў пастаяннае даручэнне — кіраваць асоавіяхімаўскай арганізацыяй завода. Работа гэта зацікавіла тав. Веправа, і ён з жарам прыняўся за яе. Па яго ініцыятыве на заводзе ўжо арганізаван узвод рабочых па вывучэнню ваеннай справы. У саставе ўзвода—ўсе комуністы, многа членаў асоавіяхімаўскай арганізацыі, актывістаў завода. Ваенныя заняткі праводзяцца рэгулярна, тры разы ў месяц. Кіруе імі лейтэнант запаса комуніст тав. Айзенштат. Праведзена ўжо трое заняткаў.

Комуніст тав. Перальман — член камісіі рабочага кантроля цэха стахановай, а тав. Клінгон з'яўляецца членам рэдкалегіі агульназаводскай насценнай газеты «Чкалавец». Абодва гэтыя таварышы сур'ёзна адносяцца да даручэнай работы, акуратна выконваюць яе.

Сакратар і члены партбюро часта гутарыць з комуністамі, аказваюць ім практычную дапамогу ў рабоце.

Нялаўна адбыўся агульны сход партарганізацыі. Абмеркавалі фінансавае становішча прадпрыемства. Увесь матэрыял па гэтаму пытанню рыхтавалі комуністы тт. Абрамовіч, Айзенштат і Багдановіч. Яны-ж былі і дакладчыкамі. Перад тым, як прыступіць да выканання даручэння, гэтыя таварышы былі дэтальна праінструктываваны сакратаром партбюро. Затым за два дні да сходу сакратар праверыў іх работу, гатоўнасць да дакладу. Аказалася, што таварышы добра спрэвіліся з даручэннем. На сходзе яны зрабілі грунтоўныя даклады.

Акуратна выконваючы партыйныя даручэнні, комуністы растуць палітычна, загартоўваюцца па рабоце. Многія комуністы яшчэ зусім нядаўна былі радавымі рабочымі, зараз з поспехам працуюць на кіруючых пасадах. Характэрны прыклад. Член партыі тав. Лапіус усяго год таму назад быў радавым рабочым тэрмічнага цэха. Ён працаваў агітатарам на выбарчым участку, часта праводзіў з рабочымі гутаркі, чытаў ім газеты. Даручэнай работай ён цікавіўся, акуратна выконваў заданні партбюро, павышаў свае палітычныя веды. Зараз ён — старшыня заводскага камітэта, карыстаецца заслужаным аўтарытэтам. На нядаўніх выбарах профгаранаў ён у другі раз выбран старшынёй заўкома.

Дзесяць год працуе на заводзе комуніст тав. Багдановіч. Ён таксама, як і тав. Лапіус, з радавых рабочых вырас да загадчыка вытворчасцю, выбран у заводскі камітэт, працуе агітатарам.

Адпак у рабоце партбюро ёсць і пэўны рад недахопаў. Не ўсе маладыя комуністы ўцягнуты ў актыўную партыйную работу. Кандыдат партыі тав. Рапапорт па працягу доўгага часу не мае партыйнага даручэння. Не мае даручэння і комуніст Грогер, калі не лічыць таго, што ён — зборшчык членскіх мопраўскіх узносаў. Між тым, т. Грогер — пісьменны комуніст і з поспехам мог-бы выканаць больш складанае даручэнне.

Некаторыя комуністы-агітатары сваю агітацыйную работу праводзяць адарвана ад жыцця завода, не ўмеюць увязваць яе з задачамі прадпрыемства, цэха. Гэта—вялікі недахоп, і яго трэба як мага хутчэй ліквідаваць. Агітацыя павінна быць дзейснай, цесна звязанай з работай завода, і мабілізоўваць рабочых на выкананне вытворчага плана.

С. КУЦАЕЎ.

ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ АДНАГО СЕЛЬСОВЕТА

Пасля мінулага справаздачна-выбарнага схода партыйная арганізацыя Халопеніцкага сельсовета прыняла кандыдатамі ў члены ВКП(б) 5 чалавек і ў члены партыі — 3.

Большасць комуністаў арганізацыі старанна павышае свой ідэйна-палітычны ўзровень. Члены і кандыдаты ВКП(б) тт. Фрыдман, Баглан, Шчаўровіч, Баркоўская і Масько самастойна вывучаюць гісторыю партыі. 13 комуністаў вывучаюць IX раздзел «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» у гуртку нізавога звяна.

Партыйная арганізацыя правяла вялікую работу па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў сельсовета. Яна здолела мабілізаваць масы калгаснікаў на барацьбу за высокі сталінскі ўраджай.

Вынікі выдатныя. Калгас «Новае жыццё» атрымаў у сярэднім з кожнага гектара па 13.5 цэнтнера жыта, 12 цэнтнераў ячменю, 200 цэнтнераў бульбы. Такі-ж даволі высокі ўраджай зняў і калгас «Шлях сацыялізма», старшынёй якога працуе комуніст тав. Чарнін. У гэтым калгасе толькі авансам калгаснікі атрымалі на працадзень па 2,2 кілограма зернавых і па 11 кілограмаў бульбы. Калгас узорна завяршыў сельскагаспадарчыя работы. Жывёле падрыхтавана цёплая і сытая зімоўка.

У рабоце пярвічнай партарганізацыі ёсць і недахопы. Сакратар партарганізацыі тав. Левін не гутарыць з комуністамі аб іх тэарэтычнай вучобе, не аказвае ім неабходнай дапамогі. Комуністы тт. Парцянка, Ільюшонак і Кухта недастаткова працуюць над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню. На заняткі ў гурток яны прыходзяць непадрыхтаванымі.

Мала ўвагі аддае партыйная арганізацыя агітацыйна-масавай рабоце. Агітпалектыў сельсовета, які складаецца з 26 агітатараў, у апошні час аслабіў сваю работу. У партарганізацыі не наладжана праверка выканання ўласных рашэнняў. Так, неадпаразова абмяркоўвалася пытанне аб развіцці грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах сельсовета. Некалькі разоў партыйны сход абавязваў комуністаў—старшынь калгасаў тт. Парцянка і Макоўскага ўкамплектаваць пагалоўем жывёлагадоўчыя фермы. Але, выносячы пастановы, партарганізацыя хутка забывалася аб іх. А комуністы тт. Парцянка і Макоўскі і да гэтага часу нічога не зрабілі для ўкамплектавання калгасных ферм.

Г. БАЯРЫН.

Халопеніцкі раён,
Мінскай вобласці.

Умовы соцыялістычнага спаборніцтва лясных прадпрыемстваў рэспублікі на 1940—1941 г.

Падтрымліваючы ініцыятыву і пачын перадавікоў соцыялістычнага спаборніцтва звенняў лесарубаў-пятнаццацітысячнікаў В. Гоціна, В. Міцкевіча, Зенавенкі і іншых у правядзенні ўсебеларускага спаборніцтва леспрамгасаў, мехлеспунктаў, брыгад лесарубаў, возчыкаў і вадзіцеляў машын,—Наркамлес БССР і рэспубліканскі камітэт профсаюза рабочых лесу і сплаву аб'яўляюць умовы спаборніцтва на лепшае правядзенне лесазагатовак IV квартала 1940 года і выкананне плана лесазагатовак і вывазкі 1941 года.

Устанаўліваюцца наступныя паказальнікі.

ДЛЯ ЛЕСПРАМГАСАЎ, МЕХЛЕСПУНКТАЎ І ЛЕСАЗАГАТОЎЧЫХ ТРЭСТАЎ

1. Датэрміновае выкананне квартальнага і гадавога плана лесазагатовак і вывазкі.

2. Перавыкананне плана прадукцыйнасці працы па загатоўках і вывазцы лесу.

3. Поўны перавод пастаяннага кадра лесарубаў і возчыкаў, а таксама максімальны перавод сезоннікаў на брыгадна-звенневы метад работы, арганізацыя звенняў пятнаццацітысячнікаў.

4. Поўнае асваенне і ўнядрэнне лучковых піл на лесазагатоўках.

5. Выкананне плана пагрузкі на чыгунку і норм пагрузкі.

6. Поўнае выкананне правілаў па тэхніцы безапаснасці.

7. Правільная арганізацыя тэхналагічнага працэса лесазагатовак. Добраякасная работа ў лесе: найбольшы выхад дзелавой драўніны і захаванне норм ОСТ'а

8. Уцягненне жанчын у звенні, брыгады на рабоце па загатоўках і вывазцы лесу.

ДЛЯ ЛЕСПРАМГАСАЎ І МЕХЛЕСПУНКТАЎ, ЯКІЯ МАЮЦЬ МЕХАНІЗАВАНЫ ТРАНСПАРТ

1. Датэрміновае выкананне праграмы механізаванай вывазкі.

2. Поўная ліквідацыя пазапланавых прастояў.

3. Выкананне плана пераабсталявання машын з вадкага на цвёрдае паліва.

4. Поўная механізацыя пагрузачных работ.

5. Арганізацыя падвозкі драўніны з прымяненнем навальшчыкаў і звальшчыкаў.

ДЛЯ ЗВЕННЯЎ ЛЕСАРУБАЎ

1. Выкананне не менш 30 норм у месяц кожным лесарубам.

2. Рацыянальная распрацоўка драўніны, выкананне правілаў тэхнікі безапаснасці.

ДЛЯ БРЫГАД ВОЗЧЫКАЎ

1. Выкананне не менш 30 норм кожным возчыкам па вывазцы і падвозцы лесу.

2. Добры догляд каня, захаванне ў належным парадку вупражы, саней, цялег і іншага інвентара.

ДЛЯ ВАДЗІЦЕЛЯЎ МАШЫН

1. Выкананне не менш 30 норм у месяц кожным вадзіцелем па вывазцы лесу.

2. Эканомія гаручага, змазачных матэрыялаў і захаванне гумы.

3. Правільная эксплаатацыя машын і поўнае знішчэнне прастояў па віне вадзіцеля.

ТЭРМІНЫ І ПАРАДАК ПРАВЕРКІ РЭЗУЛЬТАТАЎ СПАБОРНІЦТВА

Для ацэнкі работ прадпрыемстваў, якія ўдзельнічаюць у спаборніцтве, стварыць журы ў саставе: наркома лясной прамысловасці БССР т. Гайсіна (старшыня), старшыні БРК саюза рабочых лесу і сплаву т. Міхасенка, стахановца-лесаруба Асіпавіцкага леспрамгаса т. Гоціна, стахановца брыгады возчыкаў Градзянскага мехлеспункта т. Маліноўскага, упраўляючага трэста Мінлеспром т. Гольдзіна і прадстаўнікоў рэдакцый газет «Звязда» і «Советская Белоруссия».

Рэзультаты спаборніцтва падагульваюцца штомесячна, а прысуджэнне прэмій— не пазней 15 студзеня 1941 года—па рэзультатах выканання плана лесазагатовак і вывазкі 1940 года і не пазней 15 красавіка 1941 года—па рэзультатах выканання плана 1 квартала 1941 года.

ПРЫСУДЖЭННЕ ПЯРШЫНСТВА І ПРЭМІЙ

1. Леспрамгасу, мехлеспункту, заняўшым першае месца па выкананню ўмоў соц спаборніцтва, журы прысуджае пераходны чырвоны сцяг Наркамлеса БССР і БРК профсаюза рабочых лесу і сплаву і грашовую прэмію ў размеры 10 тысяч рублёў для прэміравання лепшых звенняў лесарубаў, возчыкаў, вадзіцеляў машын і інжынерна-тэхнічных работнікаў. Заняўшым другое месца — пераходны чырвоны сцяг Наркамлеса БССР і БРК сэюза і грашовую прэмію ў размеры 7 тысяч рублёў для прэміравання звенняў лесарубаў, возчыкаў, вадзіцеляў машын і інжынерна - тэхнічных работнікаў. Заняўшым трэцяе месца— грашовую прэмію ў размеры 5 тысяч рублёў для прэміравання лепшых звенняў лесарубаў, возчыкаў, грузчыкаў, вадзіцеляў машын і інжынерна-тэхнічных работнікаў.

2. Лепшым брыгадам лесарубаў і возчыкаў, заняўшым першае месца ў соцспаборніцтве па выкананню плана, прысуджаецца грашовая прэмія ў размеры 1.500 рублёў, а заняўшым другое месца — 1.000 рублёў.

3. Лепшым вадзіцелям машын, заняўшым першае месца, прысуджаецца грашовая прэмія ў 500 руб., а заняўшым другое месца—300 руб.

Наркамлес БССР і БРК профсаюза рабочых лесу і сплаву заклікае ўсіх рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых лясной прамысловасці ўключыцца ў соцыялістычнае спаборніцтва, забяспечыць поўнае выкананне плана IV квартала 1940 года, яшчэ шырэй разгарнуць стахановскі рух і сустрэць чацвёрты год трэцяй сталінскай пяцігодкі новымі вытворчымі перамогамі, вывесці лесазагатоўчую прамысловасць рэспублікі ў перадавыя рады.

Семінар работнікаў антырэлігійнай прапаганды

Выконваючы рашэнне Мінскага абкома КП(б)Б аб разгортванні антырэлігійнай прапаганды, совет ваяўнічых бязбожнікаў Мінскай вобласці 15 снежня правёў семінар старшынь раённых советаў і загадчыкаў лектарскіх груп СВБ. Прысутнічала 30 чалавек.

Удзельнікі семінара праслухалі рад лекцый па антырэлігійных пытаннях. Лектар Мінскага гаркома КП(б)Б тав. Радзенкі прачытаў лекцыю на тэму «Марксізм-ленінізм аб рэлігіі і аб шляхах яе пераадолення». Старшы навуковы работнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР тав. Махнач расказаў слухачам аб паходжанні і рэакцыйнай ролі каляд. Лекцыю «Аб паходжанні жыцця на зямлі» прачытала дырэктар Інстытута біялогіі Акадэміі навук БССР тав. Езубчык.

Трэба адзначыць, што не ўсе райкомы партыі вобласці забяспечылі яўку людзей на семінар. Не прысутнічалі, напрыклад, прадстаўнікі Грэскага, Пухавіцкага і Рудзенскага раёнаў, дзе антырэлігійная прапаганда праводзіцца вельмі слаба.

НА ТЭМЫ ДНЯ

ЗА МАСАВЫ ЛЫЖНЫ СПОРТ

Зіма ўступіла ў свае правы. Шырокія прасторы палёў пакрыліся снегам. Наступіў час для шырокага разгортвання лыжнага спорта.

На лыжы становяцца юнакі і старычі, становяцца ўсе, хто жадае скарыстаць зімовы час для загартоўкі свайго здароўя, для трэніроўкі сваіх мускулаў.

Велізарнае значэнне лыжнага спорта ў нашай краіне. Вопыт барацьбы з белафінамі паказаў, што лыжы адыгрываюць важную ролю ў рашэнні складаных ваенных аперацый. Байцы-лыжнікі маюць магчымасць хутка манеўрыраваць, аператыўна выконваць заданні камандавання.

Народны камісар абароны, маршал і Герой Совецкага Саюза тав. С. К. Тімашэнка пісаў, што «лыжны спорт, як і многія іншыя масавыя віды спорта, тым і выдатны, што ён выпрацоўвае ў чалавеку волю і настойлівасць, смеласць і ініцыятыву, фізічную загартоўку і вынослівасць. Быць фізічна рухомым, бадзёрым, сільным і здаровым гэта вельмі важна для кожнага воіна краіны соцыялізма».

Працоўныя нашай радзімы заўсёды гатовы выканаць свой звяшчэнны абавязак перад радзімай і ў патрэбны момант стаць на яе абарону. Яны падтрымліваюць і вітаюць пачын Ленінскага комсамола на правядзенню лыжнага кроса (спаборніцтва), прысвечанага XXIII гадавіне Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. У гэтых спаборніцтвах прымуць удзел шырокія масы нашай моладзі.

Зараз шырока разгортваецца падрыхтоўка да кроса. У Гомельскай, Беластоцкай, Палескай і іншых абласцях праведзены трэніровачныя выхады ў поле на лыжах. Ствараюцца лыжныя каманды на многіх прадпрыемствах і ва ўстановах.

Каля 200 фізкультурнікаў Віцебскага медыцынскага інстытута ўдзельнічаюць у рабоце лыжнай секцыі. Тут створана лыжная база. У бліжэйшы час намечана правесці скарасны дзённы і два начных лыжных паходы.

Арганізуюцца лыжныя базы ў многіх калгасах рэспублікі. Такія базы створаны ў калгасах «Шлях комуны», імені 17 верасня, «Серп і молат», Целеханскага раёна, Пінскай вобласці.

У Гродненскім тэхнікуме фізкультуры загатоўлена 100 пар спецыяльных лыж для пераховаў па перасечанай мясцовасці. Арганізаваны каманды, рыхтуюцца інструктары для кіраўніцтва работай лыжных секцый на прадпрыемствах і ва ўстановах. На акраіне горада пачата будаўніцтва лыжнага трампліна вышынёю ў 25 метраў.

За апошні час па рэспубліцы павялічыўся выраб лыж для патрэб працоўных. Так, напрыклад, пінская сталярная артэль «Рэкорд» арганізавала спецыяльны цэх па вырабу лыж, у якім працуе 15 чалавек. Цэх абсталяван новымі станкамі і механізмамі. За апошні час артэль дала прадукцыі на 413 тысяч рублёў. Да канца бягучага года артэль выпусціць больш 1000 пар лыж. Гэтыя поспехі трэба ўсямерна пашыраць.

Фізкультурныя, комсамольскія, прафсаюзныя арганізацыі павінны аказаць дапамогу ў правядзенні лыжных спаборніцтваў, арганізацыі каманд на прадпрыемствах і ва ўстановах. Іх абавязак — дабіцца, каб у спаборніцтвах удзельнічалі самыя шырокія масы працоўных.

Сустрэнем XXIII гадавіну Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі шырокім разгортваннем сапраўды масавага лыжнага спорта!

АРГАНІЗАВАЦЬ БЕСПЕРАБОЙНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЛЕСАРУБАЎ І ВОЗЧЫКАЎ

6 месяцаў пр... з моманту ства... пры Наркамлесе Беллесхарчгапла... абавязак якога ... ходзіць арганіз... бесперабойнага ... беспячэння пр... тамі і промтаў... рабочых, зан... у лясной прамысловасці.

За гэты перыяд у радзе раёнаў ... раны канторы, якія разгарнулі ганд... лесаўчастках. Нядрэнна, напрыклад, ... пізавана абслугоўванне рабочых у ... ніцкім раёне. Тут зразумелі, што асн... задача — гэта своечасовае забесп... лесарубаў і возчыкаў — людзей, ... рашаюць поспех выканання квар... плана. Бярэзінская кантора лесгапла... везла ў гэты раён на лесаўчастк... кова прадуктаў і тавараў, арганіз... развозны гандаль. Непазрэдна ў ... дзялянку завозіцца хлеб, цукар і ... прадукты. На Эсмонскім участку ... сарубаў і возчыкаў арганізован ... набыты тэрмасы для развозкі ... ежы. Ёсць кіпяцільнікі ў лесе. Ус... садзейнічае павышэнню прадукцы... працы лесарубаў і возчыкаў.

Зусім інакш працуе Чэрыкаўская ... тора лесгапла (начальнік тав. А... ка). План тавараабароту тут вы... толькі на 67 проц. Недавыбраны ... лізацыі такія фондавыя прадукты, ... рыба, зеляніны, цукар, канцтавары ... рабы і т. д. У выніку несур'ёзны... сін да справы касцюковіцкія лесар... возчыкі, якія абслугоўваюцца ма... і ларкамі гэтай канторы, цэлымі ... мі былі пазбаўлены магчымасці ат... ваць рад прадуктаў.

Не лепш працуе і Лагойская ... лесгапла, якая абслугоўвае чатыры... ны. У Бягомлі, напрыклад, да гэтага ... не ўстаноўлен кантынгент, абслуго... ларкамі лесгапла. Фондавыя пр... трапляюць людзям, якія не маюць ... адносін да лясной прамысловасці. П... ка паказала, што на Жамойскім і Г... скім лесаўчастках за месяц было пр... прадуктаў у 6 разоў менш, чым ... тральным магазіне раёна, які абслу... толькі работнікаў канторы лесп... Лагойская кантора лесгапла да ... часу не арганізавала развознага ган...

Па ўсёй сістэме Беллесхарчгапла ... тавараабароту IV квартала выкана... 62,7 проц., прычым і гэты пра... сягнут за кошт раёнаў, якія набліж... ца да поўнага выканання квар... плана. Да такіх, напрыклад, можа... несці Асіпавіцкую кантору лесхарч...

Адпак і гэтую кантору лічыць пер... ніяк нельга. Клічаўскі раён абслугоў... ца Асіпавіцкай канторай, а калі тр... па Ўбалацкі або Калбчанскі лесаў... гэтага раёна, лесарубы і возчыкі ... дзяцца на дрэнная абслугоўванне. ... праўды, адпускаемыя прадукты Асіп... кая кантора рэалізуе ў большасці ... па месцы. Гэта, як вілаць, лягчэй, ... арганізаваць развазны гандаль у ... гоўваемых раёнах. І трэба сказаць, ... іспаванне лесхарчгапла адчуваюць ... работнікі кантор леспрамгасаў і лес... чым рабочыя лясной прамысловасці.

Урад апускае ластаткова ўсякіх ... дуктаў і тавараў. Усё гэта павінна ... пасці ў рукі рабочых. Трэба з усёй ... шучаснаю змагацца з прагтыкай ... ня прадуктаў на базах і ў цэнтра... магазінах раёна і сачыць за тым, ... было злоўжываванняў і спекуляцыі.

Надышоў рашаючы перыяд лесазг... вак і вывазкі. Задача заключаецца ... каб, не марудзячы, ужо зараз зрабіць ... неабходнае для забеспячэння рабочых ... ной прамысловасці ў зімовых умов...

Снежаньскае ўзброенае паўстанне 1905 года

Кастрычніцкая ўсеагульная палітычная стачка 1905 года падвяла рабочы клас Расіі ўшчыльную да ўзброенага паўстання. Аб неабходнасці ўзброенага паўстання большэвікі гаварылі даўно. Яшчэ III з'езд партыі ў красавіку 1905 года прыняў рашэнне аб падрыхтоўцы ўзброенага паўстання.

Большэвікі арганізавалі на фабрыках і заводах баявыя дружыны. Дружыннікі вучыліся валодаць зброяй, ахоўвалі рабочыя мітынгі і дэманстрацыі.

У 1905 годзе таварыш Сталін гаварыў: «Што трэба нам, каб сапраўды перамагчы? Для гэтага патрэбны тры рэчы: першае—узбраенне, другое — узбраенне, трэцяе—яшчэ і яшчэ раз узбраенне».

Ленін і Сталін вучылі рабочы клас, што толькі ўзброеным паўстаннем можна давесці буржуазна-дэмакратычную рэволюцыю да канца—звергнуць царызм.

Узброенае паўстанне павінна было вырашыць карэнныя пытанні, аспоўныя мэты і задачы буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі: заваяванне дэмакратычнай рэспублікі, ліквідацыю памешчыцкага землеўладання, увядзенне 8-гадзіннага рабочага дня.

Вырашаючы гэтыя задачы, рэволюцыя не выходзіла за рамкі буржуазнай. Тым не менш пролетарыят быў кроўна зацікаўлен у рашучай перамозе буржуазнай рэволюцыі: давёўшы буржуазна-дэмакратычную рэволюцыю да канца, пролетарыят неадкладна пачне перахоўзіць к рэволюцыі соцыялістычнай. Рабочы клас павінен таму стаць правадыром у буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі. Далучаючы да сябе масы сялянства, пролетарыят павінен стаць на чале ўзброенага паўстання для звяржэння самадзяржаўя.

«... Усё развіццё рускай рэволюцыі з неміннучасцю штурхала да ўзброенага рашаючага бою паміж царскім урадам і авангардам класавага свядомага пролетарыята»,—пісаў Ленін (том XIX, стар. 356).

Рыхтуючыся да ўзброенай барацьбы супроць царызма, большэвікі зыходзілі з марксісцкага вучэння аб паўстанні. Паўстанне ёсць майстэрства, гаварылі Маркс і Энгельс. Выказванні Маркса і Энгельса Ленін развіў у стройнае вучэнне. Ленін вучыў, што паўстаннем пельга іграць. Раз паўстанне пачата, яго трэба весці смела і рашуча.

***

Барацьба народа супроць царызма ўзмацнялася. На чале гэтай барацьбы стаяў рабочы клас.

Восенню 1905 года шырока разгарнулася барацьба сялян супроць памешчыкаў. Сялянскія паўстанні ўспыхнулі ў Саратаўскай, Тамбоўскай, Чарнігаўскай, Тыфліскай, Кутаіскай і некаторых іншых губернях.

У радзе гарадоў пачаліся хваляванні сярод салдат. Паўсталі матросы ў Кронштаце і Севастопалі. Повадам да паўстанняў салдат і матросаў часта было грубае абыходжанне афіцэраў, дрэнны харч (так званыя «гарохавыя бунты»). Адпак гэтыя паўстанні былі разрозненыя, і царызму ўдалося іх падавіць.

У лістападзе 1905 года ў Расію з-за граніцы вярнуўся В. І. Ленін. Пад яго кіраўніцтвам партыя яшчэ шырэй разгарнула падрыхтоўку паўстання. Вялікую рэволюцыйную работу праводзіў у Закаўказзі таварыш Сталін. Ён выкрываў меншавікоў, выступаўшых супроць рэволюцыі і ўзброенага паўстання, рыхтаваў рабочых да баёў супроць царскага самадзяржаўя.

У снежні 1905 года ў Фінляндыі, у горадзе Тамерфорсе, адбывалася канферэнцыя большэвікоў. Па ёй упершыню асабіста сустрэліся два вялікія правадыры пролетарыята—Ленін і Сталін. Да таго яны падтрымлівалі паміж сабой сувязь пісьмамі або праз таварышоў. Паколькі к гэтаму часу пачалося ўжо ўзброенае паўстанне ў Маскве, то, па прадзе Леніна, канферэнцыя спешна закончыла сваю работу для таго, каб дэлегаты маглі прыняць актыўны ўдзел у паўстанні на месцах.

***

5 (18-га па новаму стылю) снежня 1905 года Маскоўскі камітэт партыі прыняў рашэнне аб усеагульнай забастоўцы і ўзброеным паўстанні. Рабочыя маскоўскіх заводаў і фабрык горача падтрымалі гэта рашэнне.

6 (19) снежня Маскоўскі совет рабочых дэпутатаў па прапанове большэвікоў прыняў рашэнне: 7 снежня, у 12 гадзін дня, спыніць паўсюду работу, пачаць усеагульную стачку, якую затым перавесці ва ўзброенае паўстанне.

Рабочыя Масквы разлічвалі, што іх падтрымаюць і салдаты. Ужо з канца лістапада маскоўскі гарнізон хваляваўся. У некаторых часцях салдаты пачалі афіцэраў, у некаторых—не падпарадкоўваліся іх загадам, адмаўляліся выступаць супроць сваіх братоў-рабочых.

У 12 гадзін дня 7 (20) снежня 1905 года ў Маскве пачалася палітычная забастоўка. Усё ў горадзе спынілася.

Пецербург Маскву не падтрымаў. На чале сталічнага пецербургскага совета гады стаялі меншавікі: Тропкі і іншыя. Яны былі супроць паўстання. Забастаўка не стала ўсерасійскай. Чыгункі баставалі, але Нікалаеўская чыгунка, звязваючая Пецербург з Масквой, прадаўжала працаваць. Па гэтай дарозе царскі ўрад мог прысылаць войскі для падаўлення маскоўскіх рабочых.

Царскія ўлады ў Маскве аб'явілі ваеннае становішча. Рабочыя сходы і дэманстрацыі разганяліся. Дом, дзе сабраліся баявыя дружыны, быў разгромлен артылерыяй.

9 (22) снежня ў Маскве паявіліся першыя барыкады. Рабочыя апракідвалі тэлеграфныя слупы, трамваі, быстра перагароджвалі вуліцы, выраблялі зброю, узбройваліся чым маглі. Хутка ўсе раёны Масквы пакрыліся барыкадамі. Паліцыя і царскія войскі абстрэльвалі барыкады з вінтовак, кулямётаў, гармат.

Рабочыя біліся з нябачаным гераізмам, хоць сілы былі няроўныя. На Лясной вуліцы, напрыклад, каля трамвайнага парка, трынаццаць рабочых-дружыннікаў за барыкадай стрымлівалі наступленне 500—600 салдат.

У тыя дні на барыкадах Масквы біліся дружына іванаваазнясенскіх і шуйскіх рабочых на чале з М. В. Фрунзе.

Яшчэ напярэдадні паўстання кіраўніцтва Маскоўскага камітэта большэвікоў было арыштавана. Паўстанне асталося без кіруючага цэнтра. Сувязі паміж раёнамі фактычна не было. Кожны раён дзейнічаў самастойна: агульнамаскоўскае паўстанне ператварылася ў паўстанне асобных раёнаў.

Замест таго каб наступаць, паўстаўшыя толькі абараняліся. Гэта было адной з важнейшых прычын паражэння паўстання. Марксісцка-ленінскае вучэнне аб паўстанні як майстэрстве прызнае, што абарона ёсць смерць узброенага паўстання.

Царскі ўрад прыслаў з Пецербурга Сямёнаўскі полк і са зверскай жорсткасцю падаўляў паўстанне. З гармат абстрэльваліся рабочыя акраіны Масквы.

Найбольш жорсткая барацьба ішла на Прэсне. Прэснянскія рабочыя гераічна адстойвалі кожную пядзь зямлі. На месцы зруйнаваных абстрэлам барыкад вырасталі новыя. Будаваць барыкады дапамагалі старыкі, жанчыны, дзеці.

Супроць рабочых Прэсні былі кінуты галоўныя сілы царскіх карацеляў. Дзядзя цара, Нікалай Нікалаевіч Раманаў, у тыя дні нагла заяўляў «Ніякай бялы для Расіі ад таго, калі Маскву разгромяць, не будзе».

Паўстанне было падаўлена. Царскія апрычнікі ўварваліся ў рабочыя кварталы. Царскі генерал Шэйдэман даў загад карацелям-сямёнаўцам: «Калі будзе аказана ўзброенае супраціўленне, то знішчаць усіх, не арыштоўваючы нікога...»

Рабочых без суда і следства расстрэльвалі. Звыш тысячы рабочых было забіта, многа тысяч—арыштавана. Прэсня была завалена трупамі паўстаўшых пролетарыяў. Горы трупаў ляжалі ля паліцэйскіх участкаў.

***

Паўстанні ў тыя дні адбываліся ва многіх гарадах і раёнах Расіі. Паўставалі рабочыя Растова і Сормава, матросы Севастопаля і Кронштата. Паднімаліся і прыгнечаныя народы Расіі. На Украіне вялікія паўстанні былі ў Горлаўцы, Александраўску і іншых гарадах. Паўстаннем была ахоплена амаль уся Грузія. У Фінляндыі рабочыя стварылі Чырвоную Гвардыю, у Латвіі справа дайшла да шырокай грамадзянскай вайны.

Снежаньскае ўзброенае паўстанне паказала магчымасць адкрытай узброенай барацьбы народа супроць царскіх войск. Гэта паўстанне было вышэйшым пунктам рэволюцыі 1905 года. Пасля паражэння паўстання рэволюцыя паступова пайшла на спад. Але рэволюцыя яшчэ не была падаўлена. Новыя атрады рабочых і сялян уцягваліся ў барацьбу. Рэволюцыя адступала павольна, з баямі.

Рэволюцыя 1905 года паказала, што большэвікі ўмеюць паступаць на чале народных мас. Яна паказала таксама, што «большэвікі навучыліся правільна адступаць, без панікі і мітусні, з тым, каб захаваць кадры, сабрацца з сіламі і, перабудаваўшыся прыстасоўна да новай абстаноўкі, зноў пайсці ў наступленне на ворага» («Гісторыя ВКП(б)», стар. 91).

Рэволюцыя паказала, што толькі пролетарыят можа быць правадыром буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі ў Расіі. Толькі пролетарыят можа давесці гэтую рэволюцыю да канца і расчысціць шлях да соцыялістычнай рэволюцыі.

У снежаньскім паўстанні рабочы клас не атрымаў належнага падтрымання сялянства. Асобныя паўстанні сялян супроць памешчыкаў не зліліся ва ўсерасійскае паўстанне супроць самадзяржаўя. Але рэволюцыя паказала, што працоўнае сялянства не гледзячы на хістанні з'яўляецца адзінай сур'ёзнай сілай, якая здольна пайсці на саюз з рабочым класам.

Салдацкія выступленні таксама былі разрозненыя і неарганізаваны. Большая частка салдат асталася вернай цару, ішла супроць рэволюцыі.

Сялянскія і салдацкія паўстанні не зліліся з рабочымі паўстаннямі. Вось у чым была адна з галоўнейшых прычын паражэння снежаньскага ўзброенага паўстання.

Ды і сам рабочы клас выступаў недастаткова дружна. У адных гарадах рабочыя пачыналі паўстанне тады, калі ў другіх гарадах паўстанні ўжо былі падаўлены. Рабочыя былі яшчэ дрэнна ўзброены. Трэба было смялей захватваць зброю. Палкам царскіх карацеляў, узброеным гарматамі і кулямётамі, няпяжка было перамагчы дрэнна ўзброеных рабочых. Даўна гое, як ледзь узброеныя рабочыя маглі так доўга абараняцца супроць полчышчаў царскіх апрычнікаў. Гэта быў сапраўдны гераізм мас.

Вялікую ролю ў паражэнні рэвалю... 1905 года адыграла і тое, што ў ... партыі рабочага класа не было неабх... га адзінства і згуртаванасці. Расійска... цыял-Дэмакратычная Рабочая П... была разбіта тады на дзве групы: ... шэвікоў і меншавікоў. Як вядома, ... шэвікі вялі паслядоўную рэволюцы... лінію і клікалі рабочых да звяржэння ... рызма. Меншавікі, наадварот, тармазі... волюцыю, блыталі значную частку ... чых, раскалвалі рабочы клас.

Паражэнню рэволюцыі садзейн... яшчэ прычыны знешняга парадку. ... віць рэволюцыю царскаму ўраду дапа... захопнеўрапейскія імперыялісты. ... баяліся за свае капіталы, укладзеныя ... Расіі, і палохаліся, што перамога ... рэволюцыі ўзніме на барацьбу рабо... Еўропы. Таму імперыялісты Еўропы ... вялікія пазыкі рускаму цару для ... лення паўстання рускіх рабочых.

Дапамагло цару і заключэнне міру ... Японіяй. Заключыўшы мір і развязаў ... сабе такім чынам рукі, цар-кат мог ... сілай абрушыцца на рэволюцыю.

***

Большэвікі і меншавікі далі ... ацэнку снежаньскаму паўстанню. Бо... вікі лічылі, што трэба было яшчэ ... рашуча, больш энергічна змагацца, ... перамагчы самадзяржаўе. Меншавікі ... несліся да паўстання апартуністы... Плеханаў, напрыклад, сказаў: «Не тр... было брацца за зброю».

Снежаньскае ўзброенае паўстанне ... пярпела паражэнне, але яно дало рабо... му класу вялікі вопыт барацьбы. Без ... пыту 1905 года пролетарыят не змог... перамагчы ў 1917 годзе.

Ленін пазней пісаў:

«Да ўзброенага паўстання ў снеж... 1905 года, народ у Расіі аказваўся ... здольным на масавую ўзброеную барацьбу ... з эксплуататарамі. Пасля снежня ... быў ужо не той народ. Ён перарадзіўся. ... Ён атрымаў баявое хрышчэнне. Ён загар... таваўся ў паўстанні. Ён падрыхтаваў ... рады байпоў, якія перамаглі ў 191... годзе...» (Ленін, т. XXIII, стар. 451).

Ад снежаньскага ўзброенага паўстання 1905 года большэвікі прывялі пролетарыят да вялікай кастрычніцкай перамогі ў 1917 годзе.

С. СТАМ.

...ЛАЦАВАЦЬ ДРУЖБУ ПАМІЖ ...ГРАМАДСКАСЦЮ І ШКОЛАЙ

...прыкладу грамадскасці Чарапанаў... раёна Новасібірскай абласці калгас... ...тніх раёнаў нашай рэспублікі раз... ...вялікую работу па аказанню ...ной дапамогі школе. Першымі ...ліся ў гэты рух калгасы «Молат» ...нар». Хутарскога сельсовета, Чэр... ...га раёна.

...пло параўнальна нямнога часу, і ...атрымалі вялікую дапамогу. У ...ую школу калгаснікі ўжо завезлі ...баметраў дроў. Калінокскую—120 ...раў. Калотзежскую—115, у сярэд... ...колу № 2 г. Чэрвеня—100 куба...

...ладу калгаснікаў Хутарскога сель... ...слевалі і іншыя калгасы. Па на... ...ну палліку па раёну завезена ...каля 2000 кубаметраў паліва. ...кі сельгасарцелі «Энергія». Гор... сельсовета, адрамантавалі ўсе Зенопальскай школе, калгаснікі ...рцелі «Завет Леніна», Калодзеж... ...ельсовета, адрамантавалі фундамент ...скай школы. калгас «Пераравік» ...сельсовета забяспечыў сваю шко... ...сам дроў на паўтара года, абста... ...жкой для фізічнага кабінета.

...тогу школе аказваюць і прадпры... раёна. Завод «Іванічы» пі... Іваніцкай школы дошкі, мех... ...дпусціў абрэзкі дошак і абавя... ...х вывезці ў школу. Швейная і ...арцелі рыхтуюць 100 камплек... ...ажу для вучняў.

...сы дапамагаюць школам не толь... ...падарчым абсталяванні, але і ва... ...ультурна-масавай і выхаваўчай ра... ...лгас «Новая пабудова» абавязаў... ...яваць пры Ачыжскай школе фіз... ...ы гарадок.

...іраўніцтвам калгаснага садавода ...кольным участку Ачыжскай ...пасаджана 30 пладовых дроў.

Пры Вішэнскай няпоўнай сярэдняй школе працуе гурток жывёлагадоўлі, пры Валевачаўскай няпоўнай сярэдняй школе—гурток па вывучэнню пярвічнага бухгалтарскага ўчота. Кіруе ім рахункавод калгаса.

Разгортваецца грамадская дапамога школе і ў іншых раёнах рэспублікі, у прыватнасці ў Смалявіцкім. Калгасы Прылепскага сельсовета загатовілі і вывезлі для Прылепскай сярэдняй школы 120 кубаметраў дроў, агарадзілі прышкольны ўчастак і загатовілі да яго насенне. Калгас імені Сталіна вызеліў для ўчастка дробны інвентар. Калгаснікі Лязенскага сельсовета загатовілі і вывезлі для школы 150 кубаметраў дроў, абсталявалі школьны клуб, зрабілі 50 парт.

Наколькі вялікія клопаты калгаснай грамадскасці аб школе, сведчыць цікавы эпізод. Ішоў сход калгаснікаў і сельскага актыва сумесна з настаўнікамі Лязенскага сельсовета па пытанню аказання грамадскай дапамогі школе. Калгаснікі з вялікім узлымам абмеркавалі пачын чарапанаўцаў. Раптам падымаецца з месца калгасны пастух.

— Чым-жа я магу дапамагчы школе?— пытае ён.

Крыху падумаўшы, пастух заявіў:

— Я для школы звяжу 50 добрых венікаў.

Прайшло нямнога часу, і ён прынёс свой скромны падарунак.

У сваю чаргу настаўнікі актыўна дапамагаюць у наладжанні культурна-масавай работы на вёсцы.

Мацнее большэвіцкае садружэства школы і грамадскасці. У гэтым садружэстве —залог вялікіх поспехаў.

Я. ГОЗДАНКЕР,
Н. ШАМЕЦЬКА.

...ПАПІРАЮЦЬ ПРАВЫ КАЛГАСНІКАЎ

...У. (Спец. кар. «Звязды»). У ве... ...гага года група калгаснікаў сель... «Чырвоны ўсход», Дзміграўскага ...сата, прыслала ў рэдакцыю «Звя... ...ь пісьмы. Аўтары расказвалі аб ...о старшыня калгаса П. Оргіш ...гаспадарку, з мэтай асабістай на... ...сысвайвае калгаснае дабро.

...ы былі высланы выканкому Кліг... ...райсовета для рэагавання. У ...ыехаў загадчык райза тав. Шар... ...былі выяўлены новыя факты ...ай дзейнасці Оргіша. 26 кастрыч... ...гаснікі сабраліся на агульны сход, ...бмеркавалі прастучкі Оргіша. Сход ...а прысваенне калгаснага дабра і ...ачынствы зняць яго з пасады ...праўлення. Тут-жа выбралі ...старшыню. 1 лістапада райза ...аў аб гэтым рэдакцыі.

...ада, справу трэба лічыць законча... ...атрымалася зусім іншае. Оргіш ...жны ізень абіваў пароги райкома ...Ён галзінамі даказваў сакратару ...па кадрах тав. Кавалёнку, што ...авільна знялі з работы.

...праз месяц, 26 лістапада, па ...тав. Кавалёнка ў калгас выс... ...уктар райкома тав. Заяц. Павяр... ...наёміўшыся са справамі ў сель... ...не, прааналізаваўшы клубока ...былога старшыні Оргіша, Заяц ...сабраў агульны сход калгаснікаў. ...многалюдным. Калгаснікі прышлі ...К(б)Б.

...аяц паставіў на сходзе адно пы... ...б аднаўленні Оргіша на рабоце. ...ці зтзвіліся. Як так? Мы знялі ...а работы, а зараз нам навязваюць ...ці раз. Заяц першым узяў слова, ...раў агульны сход аб тым, што ...ранне райкома КП(б)Б аднавіць ...а рабоце (на справе-ж такога ...райкома не было і быць не ...о).

...зтнуліся ажыўленыя спрэчкі. Адзін ...выступалі калгаснікі. Усе яны ..., што Оргіш недастойны быць кі... ...сельгасарцелі. Аднак Заяц упор... ...таяваў на сваім і зусім не лічыўся з думкай калгаснікаў. Калі справа дайшла да галасавання, ні адзін з удзельнікаў схода не падняў рукі за аднаўленне Оргіша на рабоце. Бачачы, што кандыдатура правальваецца, Заяц у другі раз узяў слова. Ён заявіў калгаснікам: «Калі вы не галасуеце за аднаўленне Оргіша на рабоце, то падыміце рукі, хто супроць рашэння райкома КП(б)Б». Каб дабіцца свайго, Заяц дапусціў неправільную, шкодную, антыпартыйную тактыку.

У пратаколе схода пад дыктоўку тав. Зайца запісалі: «Аднавіць тав. Оргіша на пасадзе старшыні калгаса на падставе рашэння райкома КП(б)Б»(?!).

Так. Заяц, інструктар Клічаўскага райкома КП(б)Б, нарушыў калгасную дэмакратыю, груба нарушыў статут сельгасарцелі, у якім запісана, што справамі калгаса кіруе агульны сход.

Каго-ж так настойліва абараняў інструктар Заяц? Факты адказваюць на гэтае пытанне. Оргіш, будучы кіраўніком калгаса, увесь час больш цікавіўся асабістымі справамі, чым грамадскай гаспадаркай. Восенню калгас адстаў з сяўбой азімых. Оргіш, каб нагнаць тэмпы, распрадзіўся 7 гектараў жыта пасеяць у атнавор. 22 гектары ён пасеяў на канюшынішчы, не захаваўшы асноўных правіл агратэхнікі. Ён прысеяў 80 кг жмыху, атрыманыя за зданыя калгасам дзяржаве 800 літраў малака. Апрача таго, Оргіш разбазарыў больш аднаго гектара калгаснай зямлі і ў сваё карыстанне захапіў 0,20 гектара. Вельмі мяста разбазарана калгаснага лесу. Фермы ў арцелі не ўкамплектаваны. На конеферме абартавала 7 конематак, але ніхто не прыцягнут за гэта да адказнасці.

Калгаснікі настойвалі на перагляде рашэння і, нарошце, дабіліся свайго. 10 снежня ў прысутнасці сакратара райкома КП(б)Б тав. Фадзеева на агульным сходзе ў троці раз было абмеркавана пытанне аб кіраўніцтве калгасам. Сход адмадушна рашыў зняць Оргіша з работы.

Цікава, якія-ж меры думае прыняць РК КП(б)Б у адносінах да свайго інструктара тав. Зайца?

Ф. РУЦКІ.

Машынна-трактарная станцыя Мірскага раёна, Баранавіцкай абласці, 11 снежня 1940 г. закончыла рамонт трактараў. На здымку: дэпутат раённага совета дэпутатаў працоўных стаханавец-трактарыст, былы батрак, тав. А. К. Шыш за работай.

Фото І. Казловіча.

БАГАЦЦЕ КАЛГАСА

У калгас імені Калініна прыехаў зоатэхнік тав. Базянкоў. Разам са старшынёй калгаса Міхасём Ажойчыкам ён доўга аглядаў калгасную сядзібу, абышоў усе фермы, выпасы і сенажаці і на развітанне сказаў старшыні:

— Вялікія справы творацъ людзі. Пройдзе які год, і вы падвоіце удой кароў.

Прайшло з таго часу амаль паўтара года. Каровы, якія давалі 550 літраў малака, цяпер даюць не менш 1.200 літраў. Вырасла пагалоўе свіней, арганізавалася аўцагадоўчая ферма. А ў гэтым годзе калгас адразу стварыў дзве новыя фермы — конегадоўчую і птушкаводчую.

Яшчэ мінулагодняй зімой, калі ў зоатэхнічным гуртку калгаса абмяркоўваліся мерапрыемствы па ўздыму жывёлагадоўлі, брыгадзір жывёлагадоўчай брыгады Васіль Ажойчык гаварыў:

— Жывёлагадоўля без кармоў — не жывёлагадоўля. Няма сілосу—няма і малака. А няма канюшыны—няма ходу і коням.

Брыгадзіра падтрымліваў 78-гадовы стаханавец — даглядчык жывёлы Сцяпан Федарычык. Ён гаварыў аб расчыстцы сенажацей ад хмызняку і куп'я, аб бульбоўніку, які прападае ў палях.

Калі прышла вясна, у поле па канюшыну вышлі падросткі збіраць каменне. У калгасе пачыналася барацьба за высокі ўраджай траў. У чэрвені, не чакаючы, пакуль трава пачне жаўцець, калгаснікі ўбралі ўсе сенажаці. Алесь Верашчака і Адам Федарычык, працуючы на жняярках, скасілі 56 гектараў канюшыны, якую добра высушылі і застагавалі ў палях.

Не драмаў і 60-гадовы Рыгор Войнэх. Разам з загадчыкам фермы ён вазіў з поля сакавітую віку і акуратна ўтрамбоўваў яе. Пазней у сілос дадалі кармавой капусты. Пад восень Васіль Федарычык зжаў жняяркай бульбоўнік. Яго таксама засіласавалі і ў вышэйку нямога перавыканалі даведзены раёнам план — закласці 200 тон сілосу.

Задоўга да заканчэння малацьбы старшыня калгаса тав. Ажойчык з дапамогай зоатэхніка тав. Базянкова прыблізна падлічваў, колькі-ж у сярэднім выйдзе кармоў па адну карову. Папярэдні падлік паказаў, што па адну галаву будзе не менш 28 цэнтнераў сілосу, 24 цэнтнераў грубых кармоў, 8 цэнтнераў бульбы і 4 цэнтнераў корнеплодаў. На ўсякі выпадак, каб не пралічыцца, рашылі эканомна расходаваць салому, застагаваць яе акуратна ў гумнах і стварыць пэўны страхавы фонд.

Набліжалася восень, халады. Работнікі ферм узяліся ўцяпляць хлявы, устаўляць шыбы, цягаць па вышкі салому. Пачалася барацьба за пяршынства: хто хутчэй падрыхтуецца да зімы. На малочнатаварнай ферме за пяршынства змагаўся брыгадзір Васілій Ажойчык на свінагадоўчай ферме—Міхаіл Ганчарык. На працягу 5 дзён Міхаіл працаваў ад цямна да цямна: аглядаў свінарнікі, устаўляў шыбы, капаў навокал свінарніка канаўкі, каб не было лішняй вільгаці. А на канюшні ў гэты час бялілі і дэзінфіцыравалі сценкі, цягалі на столь салому.

Гарачая пара ўцяплення будынкаў прайшла. Кармы для жывёлы ёсць, кармавы баланс складзен. 56 стагоў высокаякаснай канюшыны, што стаяць воддаль сядзібы і ўпрыгожваюць калгас ім. Калініна, агледжаны на якасць, абмераны і перададзены фуражыру.

Каб паленшыць якасць грубых кармоў і зрабіць іх больш пажыўнымі, рашылі ўстанавіць у калгасе кормазапарнік. Цяпер рэзанка і мякіна будуць давацца жывёле не ў сухім выглядзе, а запаранымі.

Ёсць і яшчэ адно важнае дасягненне ў рабоце фермы. Неяк вясной на агульным сходзе ў старшыні калгаса ўзнікла думка: устанавіць на ферме аўтапаілкі і пабудаваць ваданапорную вежу. Старшыню падтрымалі ўсе калгаснікі, за выключэннем 2—3 чалавек, якія занепакоіліся, што такое мерапрыемства будзе не пад сілу калгасу.

Калі пытанне пра ўстаноўку аўтапаілак вырашылі капчаткова, пачалі загатаўляць будаўнічы матэрыял: лес, вапну, цэмент, цэглу, жалеза, трубы. Убраўшы і пераараўшы бульбу, 20 мужчын і жапчын дружна вышлі на пракладку канаў і будаўніцтва ваданапорнай вежы.

Цяпер у старшыні калгаса нараджаюцца новыя планы. Ён, як і кожны член калектыва, ведае, што на палях калгаса сёлета сабрана зярна па 6.200 пудоў больш, чым летась. Людзі бачаць, што на 5 укамплектаваных фермах калгаса стаіць на адкорме 18 галоў жывёлы для продажу дзяржаве і на рынках. Рост жывёлагадоўлі, як і павелічэнне валавога збору зярна, не можа не адчуваць у росце заможнасці калгаснікаў. І старшыня марыць:

— Хачу вясной рухавічок паставіць... Будзе свая гонтарэзка і лесапілка... Электрычнасць у хаты правядзем...

А. МАТУСЕВІЧ.

Калгас ім. Калініна, Пухавіцкага раёна.

Ветраныя рухавікі ў калгасах

Калгас «Звязда», Рагачоўскага раёна, сёлета абсталяваў ваданапорную вежу ветрапым рухавіком.

Такім-жа чынам абсталяваў свае фермы калгас імені Калініна, Пухавіцкага раёна.

Заканчваецца ўстаноўка ветраных рухавікоў яшчэ ў трох калгасах рэспублікі.

ЯШЧЭ РАЗ АБ ЗАХАВАННІ ЖЫЛФОНДА

«Звязда» не раз сігналізіравала аб тым, што райжылупраўленні і ўпраўляючыя дамамі гор. Мінска мала клапоцяцца аб захаванні жыллёвага фонда, нясвоечасова робяць патрэбны рамонт. Адпускаемыя на гэтую мэту сродкі ніколі поўнасцю не асвайваюцца. Штогод не скарыстоўваюцца сотні тысяч рублёў.

Аднак ні выканком горсовета, ні райжылупраўленні не зрабілі належных вываданў з гэтых сігналаў. Становішча з захаваннем жылфонда ў гор. Мінску параней-шаму астаецца нездавальняючым. 35 проц. усіх будынкаў патрабуюць капітальнага і аднаўленчага рамонту.

У 1939 годзе асталіся неасвоенымі 1.300 тысяч рублёў. Такая-ж карціна і ў гэтым годзе. За 11 месяцаў 1940 года асвоена толькі 3.308 тыс. руб., або 67,1 проц. сум, адпушчаных на капітальны рамонт. Жыллёвае ўпраўленне выканкома Варашылаўскага райсовета план капітальных работ выканала толькі па 63,7 проц.

Сістэматычнае невыкананне планаў рамонтных работ прыводзіць да таго, што будынкі псуюцца, разбураюцца. Аб гэтым ярка сведчаць пісьмы і скаргі, паступаючыя ў рэдакцыю.

Гр-ка Шапіра ўказвае ў сваім пісьме, што кватэра, дзе яна жыве, ужо больш 10 год не рамантавалася. У выніку памяшканне прышло ў пяголнасць: падлога ўся пагніла, столь асела, пагражае абвалам, печ часткова разбурылася, заўсёды дыміць. Былы загадчык домаўпраўлення № 8 тав. Прахарчук ўвесь час толькі «абяцаў». Зараз назначан новы загадчык домаўпраўлення — тав. Баравік, але і ён не прымае ніякіх мер для правядзення рамонту.

У доме № 8 па вуліцы Папаніна жыве 18 сем'яў, — пішуць жыхары дома Жабуронак і Стальмашоў. — На працягу доўгага перыяда тут не праводзіўся рамонт. Двухпавярховы дом разбураецца, сцены з усіх бакоў далі шчыліны і аселі.

Яшчэ ў мінулым годзе тэхнічная камісія ўстанавіла неабходнасць капітальнага рамонту ўсяго будынка. Але ні кіраўнік домаўпраўлення № 112 тав. Савіч, ні жылупраўленне Каганавіцкага райсовета не прынялі мер, каб своечасова зрабіць рамонт. Толькі гэтымі днямі, калі будынак пачаў абвальвацца, райсовет распарадзіўся аб правядзенні рамонту.

Такое-ж становішча з домам № 12 па Парашутнай вуліцы. Загадчык домаўпраўлення № 114 тав. Маслоўская ўжо даўно заключыла дагавор з рамонтным трэстам па правядзенне капітальнага рамонту дома. Аднак рамонт з месяца ў месяц адкладваецца. Парэшце, рашылі пачаць яго ў 1941 годзе. Ці будзе вытрыман гэты «апошні» тэрмін — цяжка сказаць. Між тым будынак усё больш разбураецца.

Такіх фактаў можна прывесці многа.

Выканком гарадскога совета, які нясе поўную адказнасць за захаванне жыллёвай гаспаларкі Мінска, аддае мала ўвагі гэтай важнейшай справе. На пасяджэннях выканкома не раз абмяркоўвалася пытанне аб ходзе рамонту дамоў, прымаліся рэзалюцыі, якія ў большасці выпадкаў не выкананы.

IV сесія Мінгорсовета ў сваім рашэнні абавязала выканком прыняць усе меры для поўнага заканчэння рамонтных работ да 1 лістапада. Аднак і гэта рашэнне асталося невыкананым.

Пры выканкоме горсовета ёсць спецыяльны рамонтны трэст, які выконвае большасць капітальных работ. Аднак да гэтага часу пры трэсце не створана неабходная матэрыяльная база. Сталярная і слясарная майстэрні па сваёй магутнасці могуць абслужыць толькі бягучы рамонт будынкаў. З-за адсутнасці сушылкі драўляныя дэталі вырабляюцца з сырой драўніны, якая хутка ўсыхае. Таму не дзіўна, што гатовыя аб'екты часта здаюцца ў эксплаатацыю з вялікімі дэфектамі. У дзвярах, акопных рамах паяўляюцца вялікія шчыліны.

З наяўных 12 аўтамашын на-халу толькі тры. Гэта перашкаджае своечасовай дастаўцы матэрыялаў на будаўніцтва.

У трэсце павінны круглы год працаваць не менш 350—400 рабочых. Аднак у летнія месяцы тут працавалі толькі 180—200 будаўнікоў. Але і для іх не створаны нармальныя ўмовы работы. У трэсце ёсць толькі два інтэрнаты на 90 рабочых. Памяшканні дрэнна абсталяваны, ложкі паламаны, няма пасцельных прылад. З будаўнікамі не праводзяць ніякай культурна-выхаваўчай работы.

Бягучыя рамонты выконваюць, галоўным чынам, самі домаўпраўленні. Аднак райжылупраўленні не правяраюць правільнасць выпаткавання адпушчаных сродкаў, якасць выкананых работ, не ажыццяўляюць патрэбнага тэхнічнага нагляду. Домаўпраўленне № 5 згодна плана павінна было ў 1940 годзе адрамантаваць 28 аб'ектаў. Адрамантавана толькі тры. Большасць адпушчаных сродкаў укладзены ў капітальны рамонт аднаго дома.

Ва ўсім гэтым прычыны сістэматычнага невыканання планаў рамонтных работ.

А. ДРЫКЕР.

Нядбайныя гаспадарнікі

Вось ужо каля двух месяцаў, як калектывы інстытутаў эканомікі, торфу і батанічнага сада Акадэміі навук БССР штодзённа не працуюць па 1,5—2 гадзіны з-за адсутнасці святла. У той-жа час у побач размешчаных пакоях Навукова-даследчага інстытута харчовай прамысловасці і лабараторыі НК Тэкстыльпрома ёсць электрычнасць. Гаспадарчая частка Акадэміі пад усякімі прадлогамі атмяўляецца ўключыць памяшканні інстытутаў у агульную праводку, хаця для гэтага ёсць усе магчымасці.

У нашых інстытутах не створаны элементарныя ўмовы для нармальнай работы. Няма кіпятку. У буфеце не знойдзеш чаю, ды і знаходзіцца ён у другім крыле. Каб напасці ў яго, трэба прайсці праз увесь двор. Прыбіральні ў памяшканнях закрыты.

Мы звярталіся па гэтаму пытанню ў прэзідыум Акадэміі, у БРК саюза работнікаў навукова-даследчых устаноў, а таксама і да гарадскога пракурора, але без рэзультатна.

Неабходна стварыць нармальныя ўмовы работы ў інстытутах эканомікі, торфу і батанічным садзе Акадэміі навук БССР.

ЧАРНЯЎСКІ, ЧАРКЕЦКІ, С. НІСЕНБАУМ і інш. (усяго 14 подпісаў).

Па слядах неапублікаваных пісем

У пачатку кастрычніка гэтага года ў рэдакцыю газеты «Звязда» паступіла пісьмо аб безгаспадарчасці і злоўжываннях у мінскім дзіцячым садзе № 42.

Аўтар пісьма ўказваў, што дзяцей дрэнна выхоўваюць, часта караюць, прадукты сістэматычна раскрадваюцца. Загадчык дзіцячага сада Жукоўская вельмі груба адносіцца да тэхперсанала. На працягу доўгага часу Жукоўская выкармлівала сваіх свіней прадуктамі, адпушчанымі для сада.

Аб гэтым ведалі адзел народнай асветы Варашылаўскага раёна г. Мінска і Мінгарана. Аднак ніхто не прыняў ніякіх мер для ліквідацыі агідпасней.

Як паведаміў нам намеснік наркома асветы БССР тав. Чарноў, факты, указаныя ў заметцы, пацвердзіліся. Прыняты меры да паляпшэння работы дзітсада. Загадчык Жукоўская знята з работы, справа перадана следчым органам.

За недастатковае кіраўніцтва дзіцячымі садамі і нясвоечасовае рэагаванне на сігналы вынесена папярэджанне часова выконваўшай абавязкі загадчыка Мінгарана тав. Уласевіч. Загадчыку Мінскага гарана і загадчыку райана Варашылаўскага раёна прапанавана ўзмацніць кіраўніцтва і кантроль за работай дзіцячых садоў гор. Мінска.

...ЖНАРОДНЫ АГЛЯД

...ражская вайна пралаўжаецца ўжо ...цаў. Пачынаецца другая зімняя ...Тэорыя, закладзеная, мары аб ка... ...маланкападобнай» схватцы, аб ...ні рашучай перамозе ў пайкарад... ...ермін з дапамогаю двух-трох за... ...ых удараў па ворагу не вытры... ...вырабавання рэчаіснасці. Пасля ра... ...перадый мінулай вясной і летам вай... ...ны набыла, захоўвае і, відаць, за... ...крайняй меры на бліжэйшую бу... ...характар упорнай зацяжной ба... ...а шматлікіх і ўсё больш распы... ...франтах.

...месяц з дня ў дзень, з ночы ў ...не дазлезячы па наступленне зімы і ...чыя метэаралагічныя ўмовы, ...ія авіяцыя бамбардыруе Англію, ...кая — Германію. Паўтара месяца ...ёсткія баі на італа-грэчаскім ...горных далінах і заваленых ...ніпах Албаніі. На працягу ...зесяці ізён зноў ажывіліся апе... ...замёршым было з верасня паў... ...ыканскім фронце — у Заходняй ...у паласе граніцы паміж Егіптам ...ома, ваенныя аперацыі ў Захо... ...пыні пачаліся ў канцы лета на... ...ем італьянскай арміі, сканцэнт... ...най Лівіі, пад камандай маршала ...Мэтай наступлення, па аднаўшы... ...ы зарубежнага друку, быў вы... ...ліну Ніла і захват партовага го... ...Александрыі (Егіпет), пралстаўляю... ...аў'ную базу брытанскага флота ва ...ны частцы Міжземнага мора.

...Грацыяні, захваціўшы ў другой ...авіне верасня Сідзі-Барані, спыніла на... ...ен. Італьянскае афіцыяльнае тэле... ...агенцтва Стэфані аб'ясняла наступ... ...прапяглую паузу неабходнасцю ...пягнць за новай лініі фронта тыла... ...палепшыць шляхі зносін, нала... ...ньне вострага дэфіцытнай ва... ...ступні вадой. Абшырныя рабо... ...ізеныя з гэтай мэтай італьян... ...інжынерымі часцямі, безумоўна, ...і пазіцыі арміі Грацыяні.

Англійскае камандаванне таксама скарыстала стварыўшуюся паузу для ўмацавання сваіх сіл у Егіпце. У пачатку вайны яно разлічвала прымяніць для абароны Егіпта сканцэнтраваныя ў Сірыі французскія войскі. Апрача таго меркавалася, што французскія часці, сканцэнтраваныя ў Тунісе, будуць настолькі адцягваць значную частку італьянскіх сіл у Лівіі, што Грацыяні не зможа вызеліць дастатковай колькасці дывізій для наступлення на Егіпет. Выходзячы з гэтых меркаванняў, англійскі генеральны штаб трымаў у Егіпце нямнога войск. Калі Францыя капітуліравала, суадносны сіл на рубяжах Егіпта склаліся ў карысць праціўнікаў Вялікабрытаніі. Аднак за апошнія два-тры месяцы англійскаму камандаванню ўдалося перакінуць у Егіпет буйныя падмацаванні. Па палліках зарубежных ваенных спецыялістаў колькасны брытанскай арміі тут была даведзена да 300 тысяч чал. Армія была багата забяспечана самалётамі, танкамі, сродкамі транспарта, спецыяльна прыстасаванымі для руху ва ўмовах пустыні.

Ход ваенных дзеянняў на італа-грэчаскім фронце таксама сардзейнічаў умацаванню брытанскіх пазіцый у Егіпце. Пачаўшаеся ў сярэдзіне лістапада наступленне грэчаскіх войск развівалася паспяхова. Грэчаскія часці прасунуліся кілометраў на 50 у глыб албанскай тэрыторыі, а ў Паўднёвай Албаніі і яшчэ больш. Грэкі захвацілі гарады Корчу, Пагразец і Аргірэкастрон, якія служылі да таго аперацыйнымі базамі італьянскай арміі, занялі таксама порт Санты-Кваранта, адзін з важнейшых пунктаў высадкі італьянскіх сіл на албанскім узбярэжжы. Пры гэтым былі захвачаны буйныя склады, значная колькасць палонных і т. д.

Зразумела, пры апэнцы далейшых перспектыў заўсёды неабходна ўлічваць, што ў канчатковым выніку італьянская армія мае, безумоўна, больш шматлікія рэзервы і тэхнічна аснащана значна лепш грэчаскай. Таму значэнне абстаноўкі, якая склалася за апошні месяц па італа-грэчаскім фронце, заключаецца, па думцы зарубежных назіральнікаў, галоўным чынам, у тым, што праціўнікам Англіі не ўдалося прабіцца к грэчаскаму ўзбярэжжу Эгейскага мора і што Албанія адцягвае зараз тыя італьянскія рэзервы (у прыватнасці паветраныя), якія ў іншых умовах магілі-б быць пасланы ў Лівію.

Амерыканскія газеты побач з гэтым адзначаюць, што палёт англійскай авіяцыі па марскую базу Таранто (у Паўднёвай Італіі) нанёс істотныя страты італьянскаму флоту, змяніўшы да далейшай выгады Англіі суадносіны сіл на Міжземным моры.

З другога боку, яшчэ два месяцы таму назад у сувязі з паездкай англійскага ваеннага міністра Ідэна ў Егіпет, лондонская «Дэйлі тэлеграф энд Морнінг пост» пісала, што па Бліжнім Усходзе Англія не мае намеру абмежавацца абаронай. Няжка сказаць, ці былі ўлічаны гэтыя намёкі італьянскім камандаваннем. Але палобна, што, калі ў ноч з 8 па 9 снежня англійскія часці, сканцэнтраваныя супроць правага (паўднёвага) фланга арміі Грацыяні, перайшлі ў наступленне, гэты ўдар аказаўся для праціўніка ў значнай меры нечаканым.

Згодна брытанскіх зводак англійская ўдарная група захваціла італьянскі ўмацаваны лагер і затым, рухаючыся з поўдня на поўнач, вышла на ўзбярэжжа на захад ад Сідзі-Барані, адрэзаўшы сканцэнтраваныя тут італьянскія дывізіі. Услед за тым англійскія войскі занялі Сідзі-Барані і прасунуліся далей на захад у напрамку лівійскай граніцы. Пры гэтым імі, згодна амерыканскіх паведамленняў, захвачана 50 тысяч палонных, у тым ліку 5 генералаў.

Аб далейшых перспектывах англійскіх аперацый пакуль гаварыць рана. Іншакраінныя назіральнікі лічаць, што ва ўсякім выпадку наступленне генерала Уэйвела (камандуючы англійскімі войскамі на Бліжнім Усходзе) у значнай меры знішчае пагрозу брытанскім пазіцыям у Егіпце, у прыватнасці ў Александрыі і ў зоне Суэцкага канала. Яны падкрэсліваюць разам з тым, што, наперакор шматлікім прадказанням, басейн Міжземнага мора яшчэ не стаў арэнай такіх аперацый, якія магілі-б прадвызначыць зыход еўрапейскай вайны.

***

Нядаўна памёршы англійскі пасол у Вашынгтоне лорд Латыян у заяве, апублікаванай за дзень да смерці, заклікаў ЗША аказаць Англіі дапамогу «самалётамі, ваенным снаражэннем, суднамі і фінансамі», указваючы, што без амерыканскай дапамогі Брытанія не ў стане перарываць германскія пагрозы яе марскім зносінам. Прадстаўнік англійскага міністэрства ваеннага снабжэння ў ЗША Лейтон у сваёй нядаўняй заяве таксама гаворыць аб вострай патрэбе Англіі ў грузавых суднах.

Разам з тым, паводле даных іншакраінага друку, за апошні час значна ўзмацняецца амерыканская дапамога Вялікабрытаніі. Паводле паведамлення вашынгтонскага карэспандэнта «Дэйлі мэйл», урад ЗША прадастаўляе ў распараджэнне Англіі 150 грузавых суднаў. Англійскі міністэр гандлёвага суднаходства Рапальд Крос заявіў на пасяджэнні палаты абшчын, што «на суднабудаўнічых верфях ЗША ўжо размешчаны першыя заказы на пабудову 60 грузавых параходаў для Англіі». «Нью-Йорк геральд трыбюн» паведамляе, што брытанскі ўрад апрача таго рашыў пабудаваць у ЗША ізве ўласныя верфі. Карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс тэлеграфіруе, што 40 амерыканскіх лётчыкаў прымаюць рэгулярны ўдзел у пералятаванні амерыканскіх бамбардыроўшчыкаў у Англію. Паводле вестак «Нью-Йорк таймс», амерыканская авіяцыйная фірма «Кертыс Райт» спыніла пастаўку самалётаў для амерыканскай арміі і ўсю сваю прадукцыю экспартыруе ў Англію, пасылаючы туды штодзённа па 7 знішчальнікаў. Сенатар дэмакрат Адамс выступіў з заявай, у якой патрабуе, каб ЗША адпраўлялі ў Англію 60 процантаў прадукцыі сваёй авіяцыйнай прамысловасці. Зараз, як вядома, адпраўляецца 50 процантаў.

Апошні час паміж знаходзячымся ў ЗША памочнікам англійскага міністра фінансаў Філіпсам і амерыканскім міністрам фінансаў Моргентау вяліся перагаворы аб аказанні Англіі фінансавай дапамогі. Паводле паведамлення агенцтва Асошыэйтэд Прэс, Англія ўжо афіцыяльна звярнулася з падобнай просьбай да амерыканскага ўрада.

Пытанне аб фінансавай дапамозе Англіі, якое будзе абмяркоўвацца ў кангрэсе ў студзені, выклікае значныя разнагалоссі ў правячых кругах ЗША. Але кіруючыя органы амерыканскага друку і рад відных амерыканскіх палітычных і фінансавых дзеячоў выказваюцца ў карысць фінансавай дапамогі. Пры гэтым высоўваюцца разнастайныя праекты абходу існуючага законадаўства, якое перашкаджае пакуль прадастаўленню пазык і крэдытаў Англіі.

***

Пагранічныя сутычкі паміж войскамі Таі (Сіяма) і войскамі Французскага Інда-Кітая прадаўжаюцца.

Са знешняга боку сутнасць канфлікта зводзіцца да наступнага. Таі фармальна незалежная дзяржава, фактычна-ж поўканіяльная краіна Паўднёвай Азіі, размешчаная паміж Французскім Інда-Кітаем і Брытанскай Бірмай. Насельніцтва Таі 15 млн. чалавек. Краіна надзвычай багата ўсякага роду выкапнямі (волава, вальфрам, золата), высокакаштоўнымі пародамі лесу і з'яўляецца адным з важнейшых сусветных пастаўшчыкоў рысу. У свой час паміж Англіяй і Францыяй было заключана пагадненне аб размеркаванні сфер уплыву ў цяперашнім Таі, прычым Англія ў якасці сферы ўплыву атрымала заходнюю частку краіны, прылягаючую к Бірме, а Францыя—усходнюю, пагранічную з Інда-Кітаем. Побач з гэтым Сіям вымушан быў уступіць Францыі частку сваёй тэрыторыі, якая была ўключана ў саставу Французскага Інда-Кітая.

Пасля капітуляцыі Францыі ўрад Таі звярнуўся да інда-кітайскіх улад з радам патрабаванняў, якія затычаць перш за ўсё звароту тэрыторый, пераданых у канцы мінулага і пачатку XX стагоддзя Францыі. Гэтыя патрабаванні былі адхілены. Урад Таі праз некаторы час прад'явіў іх зноў. Новая адмова з боку французскіх улад і паслужыла прадлогам к канфлікту, які суправаджаўся пагранічнымі сутычкамі, палётамі авіяцыі Таі па гарады Інда-Кітая і французскай авіяцыі — па гарады Таі.

Трэба адзначыць, што канфлікт з самага пачатку набыў міжнароднае значэнне. Пасланнік ЗША ў Таі яшчэ мінулым летам палічыў неабходным папярэдзіць урад, пры якім ён акрэдытаван, што Злучаныя Штаты не адабраюць патрабаванняў, прад'яўленых французскім уладам.

Нью-Йоркская «Геральд трыбюн» у пачатку снежня пісала аб «моцнай падазронасці, што Японія захвочвае памаганні Таі вярнуць сабе ўтрачаныя тэрыторыі».

Зарубежны друк ва ўсякім выпадку схільны падаваць падзеям па граніцы паміж Таі і Інда-Кітаем прыкладна той-жа трывожны сэнс, што і канцэнтрацыі японскіх войск на востраве Хайнань. Агенцтва Асошыэйтэд Прэс паведамляла падаўна аб канцэнтрацыі японскіх сіл таксама на астравах Спратлі, яшчэ далей па поўдзень на шляхах да Галандскай Індыі. Прызнанне «ўрада» Ван Цзін-вея у гэтай сувязі расцэньваецца амерыканскай і англійскай прэсай як спроба Токіо, хоць-бы чыста фармальна, замацаваць свае пазіцыі ў Кітаі, у момант калі значная частка японскіх войск адцягваецца адсюль для выканання новых задач у зоне Паўднёвых мораў.

Сусветны друк канстатыруе, аднак, што прызнанне «ўрада» Ван Цзін-вея Японіяй выклікала новае абвастрэнне адносін паміж Токіо, з аднаго боку, Вашынгтонам і Лондонам — з другога. ЗША і Англія рэагіравалі на яго не толькі дэкларацыямі аб тым, што яны парапейшаму прызнаюць толькі ўрад Чан Кай-шы, але і прадастаўленнем Чан Кай-шы новых пазык. Апрача таго ўрад ЗША аб'явіў аб увядзенні з 30 снежня новых абмежаванняў на вываз жалезнай руды, чыгуна, ферасплаваў і некаторых відаў жалезных і стальных вырабаў. Агенцтва Асошыэйтэд Прэс адкрыта ўказвае, што гэта пастанова накіравана, галоўным чынам, супроць Японіі.

І. МІКУСОН.

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 19 снежня. (ТАСС). Вярхоўнае каманданне паведамляе: «Учора днём і ноччу з прычыны неспрыяючых метэаралагічных умоў германская авіяцыя абмежавалася разведкай. У Паўночным праліве была скінута бомба на гандлёвае судно праціўніка, папаўшая ў машынае аддзяленне і нанесшая судну цяжкія пашкоджанні. Бомбай буйнага калібра скінутай на другое непрыяцельскае гандлёвае судно, прабіта яго насавая частка. Каманда судна высадзілася ў выратавальныя лодкі.

У ноч на 19 снежня англійскія самалёты скінулі некалькі бомб над паўднёва-заходнімі раёнамі Германіі, але нанеслі толькі нязначныя пашкоджанні будынкам. Забіт адзін чалавек».

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 19 снежня. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора не было зроблена ні аднаго налёту на Англію. Вечарам англійскія знішчальнікі збілі адзін германскі бамбардыроўшчык недалёка ад Дуўра.

Ноч на 19 снежня прайшла без аб'яўлення паветранай трывогі. Германскія самалёты другую ноч падрад не паяўляліся над Англіяй. У кампетэнтных кругах мяркуюць, што гэта аб'ясняецца неспрыяючымі метэаралагічнымі ўмовамі па кантынеце.

Англійская авіяцыя, не гледзячы на неспрыяючыя метэаралагічныя ўмовы, у ноч на 19 снежня бамбардыравала Мілан і Мангейм.

ЛОНДАН, 19 снежня. (ТАСС). Англійскае міністэрства авіяцыі 19 снежня апублікавала наступнае камюніке: «У ноч на 19 снежня самалёты англійскай авіяцыі зноў бамбардыравалі Мангейм. Узнікла чатыры буйныя пажары. Другое злучэнне англійскіх самалётаў бамбардыравала завод у Мілане, доклі ў Генуі і адзін аэрадром у Паўночнай Італіі. Было адзначана што ў Мілане ўсныхнуў вялікі пажар».

Зводка італьянскага камандавання

РЫМ, 19 снежня. (ТАСС). Італьянскае каманданне паведамляе: «У Паўночнай Афрыцы пралаўжаюцца баі ў раёне Бардыі, дзе сканцэнтрываны значныя матарызаваныя злучэнні праціўніка. Супроць некаторых прабаваўшых наблізіцца да горада часцей былі прадпрыняты паспяховыя контратакі. Авіяцыя эфектыўна бамбардыравала матарызаваны транспарт праціўніка.

Ва Усходняй Афрыцы італьянскія самалёты зрабілі налёты на вакзал, аэрадром і ўмацаваныя лагеры Геларэфа, Порт Судан і Розейрэс. Усюды адзначаны пажары і ўзрывы. У завязаўшымся над Порт-Суданам баі збіт адзін англійскі самалёт.

Налёт авіяцыі праціўніка на Метэма і Эргейса закончыўся беспаспяхова.

На грэчаскім фронце ў сектары 9-й арміі адзначалася дзейнасць артылерыі. Учора нашы караблі падверглі эфектыўнай бамбардыроўцы пазіцыі ў раёне Лакова. Авіяцыя бамбардыравала скапленні войск праціўніка ў раёне Аргіракастропа, Маргопе і Калопіа (Эрсеке).

У Паўночнай Італіі самалёты праціўніка скінулі бомбы ў ваколіцах Верчэлі: пашкоджана чатыры дамы. Апрача таго быў зроблен налёт на Мілан дзе пашкоджана некалькі будынкаў. У Генуі ў выніку бамбардыроўкі ёсць разбурэнні, але афяр няма».

Ваенныя дзеянні ў Албаніі

АФІНЫ, 19 снежня. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, учора грэкі правялі паспяховыя аперацыі мясцовага характару на розных участках фронта. Узята многа палонных, а таксама захвачана вялікая колькасць ваеннай маёмасці.

НЬЮ-ЙОРК, 19 снежня. (ТАСС). Як паведамляе амерыканскі друк, у Афінах афіцыяльна аб'яўлена, што ў раёне Клісуры і Тэпелене пралаўжаюцца жорсткія баі. Горад Клісуры знаходзіцца пад артылерыйскім абстрэлам. Прасоўваючыяся да Клісуры грэчаскія войскі сустрэлі супраціўленне італьянскага батальёна берсальераў. Італьянскія пазіцыі паміж Прэметам і Клісурай абараняюць 50 танкаў. У прыбярэжным сектары зноў прыбыўшыя італьянскія падмацаванні абараняюць порт Хімара.

На марозе, ідучай уздоўж ўзбярэжжа, грэкамі занят на поўдзень ад Валоны пункт Паласа.

Паводле апошніх вестак, італьянскія алборныя войскі прадпрынялі контратаку ў раёне Палермо, дзе захвацілі важныя пазіцыі грэкаў. Аднак грэкі прадпрынялі новае наступленне і пасля пяжкай бітвы зноў занялі свае ранейшыя пазіцыі. Італьянцы панеслі вялікія страты.

На паўночна-ўсходнім фронце грэкі пераправіліся над прыкрыццём артылерыйскага агню праз раку Тамарыца і дасягнулі схілаў горнага хрыбта Томар.

ЛОНДАН, 19 снежня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рейтэр, учора раніцой грэчаскія часці зноў пайшлі ў наступленне супроць італьянскіх пазіцый на захад ад вёскі Трэсова, прыкрываючай шлях да Эльбасана. Перад наступленнем адбылася моцная артылерыйская падрыхтоўка. Італьянскі перадавы пост быў захвачан знянацку, а часці, утрымліваючыя яго, паспешна адступілі на ўмацаваныя пазіцыі. Грэкамі ўзята некалькі дзесяткаў палонных.

Грэкі вышэспілі італьянцаў з паўночных і паўночна-ўсходніх схілаў гары Сківовік. Усходні схіл гары быў узят пасля рукапашнага бою. Італьянцы адступаюць да Клісуры.

Міжнародная хроніка

⊙ У Японіі, паводле вестак «Бюро даследвання жыцця насельніцтва ў ваенны час», заработная плата настаўнікаў пачатковых школ на 20 іен ніжэй месячнага пражытачнага мінімума і ў сярэднім не перавышае 70—80 іен, 274.150 настаўнікаў, якія працуюць у 4.150 школах, атрымліваюць у сярэднім 60 іен у месяц.

⊙ Французскі банк павялічыў аванс ураду на ўтрыманне германскай акупацыйнай арміі з 60 да 73 мільярдаў франкаў.

⊙ З 16 снежня ўсе ўвазімыя ў Германію тавары галандскага паходжання аслабяняюцца ад пошлін.

⊙ Да канца верасня на работы ў Германію было паслана 340 тысяч польскіх рабочых, якія скарыстоўваліся ў сельскай гаспадарцы і на прамысловых прадпрыемствах.

⊙ У Балтыморы (ЗША) на заводзе, які выконвае ўрадавыя заказы на вымяральныя прыборы для самалётаў, ваенных караблёў і войск сувязі, узнік сільны пажар. Удалося выратаваць прыбораў на 600 тысяч долараў.

⊙ У горадзе Карэ (Ірландыя) у лагеры для інтэрніраваных за апошні тыдзень двойчы адбываліся хваляванні, выкліканыя зніжэннем норм выдачы харчавання. Зняволеныя падпальвалі свае бараки. Турэмнай аховай адзін зняволены забіт, 3 ранены.

⊙ У Карлскугу (Швецыя) на парахавым заводзе адбыўся ўзрыў. Узнікшы пры гэтым пажар быстра ахапіў заводскія будынкі. Мяркуюць, што ранена каля 15 чалавек.

⊙ Марское міністэрства ЗША заключыла дадатковыя кантракты на пабудову 40 эсмінцаў коштам прыблізна ў 253 мільёны долараў.

ЗІМНЯЯ ВУЧОБА У МІНСКІМ АЭРАКЛУБЕ

Узнімаючы за сабой снежны віхор, самалёт імкліва пакаціўся па аэрадрому і праз некалькі секунд падняўся ў паветра. Самалёт вядзе вучань 10-га класа 47-й сярэдняй школы Магдалёў.

Праз поўгадзіны тав. Магдалёў дакладвае інструктару Капыціну аб выкананні задання.

У гэтым годзе Мінскі аэраклуб імені Молакава ўпершыню праводзіць абучэнне курсантаў лётнай практыцы ў зімовых умовах. Вучлёты ўжо дастаткова прывыклі да марознага ветру, навучыліся арыентыравацца пры пасадцы на снежным полі і лятаюць зараз самастойна.

21 снежня адбудзецца чарговы выпуск маладых пілотаў. Большасць курсантаў прайшла медыцынскую і мандатную камісіі і залічаны курсантамі ваенных авіяцыйных школ. Сярод іх — выдатнікі лётнай вучобы: студэнт дарожна-механічнага тэхнікума тав. Дзенісенка, вучань 10-га класа 19-й школы тав. Халадзінскі, рабочы фабрыкі «Комунарка» тав. Лукашэвіч і іншыя.

25 снежня лётнай практыкай пачне займацца другая група вучлётаў. Зараз яны заканчваюць вывучэнне матэрыяльнай часткі самалёта, матора, аэрадынамікі. (БЕЛТА).

Вечар яўрэйскіх пісьменнікаў Літоўскай ССР

18 снежня ў мінскім Доме пісьменніка адбыўся вечар сустрэчы яўрэйскіх пісьменнікаў Літвы Д. Умру і Х. Гразе з грамадскасцю Мінска. Тав. Умру ва ўступным слове расказаў аб новым, шчаслівым жыцці працоўных Літоўскай ССР. Затым тт. Гразе і Умру прачыталі свае вершы і навелы.

На вечары выступілі яўрэйскія совецкія пісьменнікі БССР тт. Аксельрод, Камянецкі, Платнер, Фінкель і іншыя.

(БЕЛТА).

Вясёлымі будуць канікулы

БЕЛАСТОК. (БЕЛТА). Весела правядуць зімовыя канікулы школьнікі Беластока. У горадзе на Совецкай плошчы ўстанаўліваецца 12-метровая ёлка, вакол яе абсталёўваюцца ларкі з цацкамі, арганізуюцца захапляючыя атракцыёны. Ва ўсіх школах пачалася падрыхтоўка да правядзення навагодніх ёлак, касцюміраваных балаў-маскарадаў. У кожнай школе рыхтуюцца вечары мастацкай самадзейнасці.

У часе канікул намечана правесці лыжныя пераходы і канькабежныя спаборніцтвы.

Цікавыя матэрыялы па гісторыі Бабруйска

БАБРУЙСК. Работнікамі краязнаўчага музея выяўлен рад цікавых матэрыялаў па гісторыі Бабруйска. Першае ўпамінанне аб горадзе адносіцца да 1508—10 гг. Летапісец, апісваючы паход вялікага князя маскоўскага Васілія Іаанавіча III супроць польскага войска, упамінае: «... вси Бобруйское, жители коей рыбьей ловлей и промыслом бобровым промышляют».

Вялікую цікавасць прадстаўляюць матэрыялы аб гісторыі Бабруйскай крэпасці, будаўніцтва якой пачалося ў 1801 годзе. Крэпасць у свой час лічылася буйнейшай у Еўропе. Ключы ад крэпасці знаходзяцца зараз у мінскім гістарычным музеі.

Радам гістарычных дакументаў пацвярджаецца, што камандуючы гарнізонам Бабруйскай крэпасці палкоўнік Павало-Швейкоўскі быў членам паўднёвага таварыства дзекабрыстаў і быў звязан з Пестэлем. Па загадзя распрацаванаму плану ўзначальваемы палкоўнікам гарнізон павінен быў паўстаць і з'єднацца з Чарнігаўскім палком. Але здзейсніць гэта не ўдалося. Павало-Швейкоўскі быў арыштаван і саслан у Сібір.

(БЕЛТА).



У мінскім Палацы піонераў для заняткаў юных натуралістаў ёсць зімовы сад і аранжарэя. На здымку: на занятках у аранжарэі. Гуртком кіруе педагог І. А. Хаст.

Фото М. Мінковіча.

АБ СКАРЫСТАННІ КЛЯНОВАГА І БЯРОЗАВАГА СОКУ

Лясныя багацці БССР слаба скарыстоўваюцца ў мэтах расшырэння мясцовай харчовай прамысловасці. Між тым, рад народ дрэў пры правільным скарыстанні іх можа папоўніць асартымент нашай харчовай прадукцыі.

У прыватнасці, распаўсюджаны ў БССР востралістны клён змяшчае ў сваім соку, паводле даных трэста Белхімлеса, 1,3 — 1,7 проц. цукру. Паводле даных Башкірскай АССР, процант утрымання цукру даходзіць да 2,5—3,5. У сярэднім адно падсочнае кляновае дрэва за сезон можа даць 25—37 літраў соку, з якога можна вырабляць сіроп, цукар і спірт.

Нельга сказаць, што ў БССР не праводзіліся вопыты здабычы кляновага соку і вырабу з яго сіропу. Яшчэ да 1932 г. Гомельскім навукова-даследчым інстытутам лясной гаспадаркі было падсочана 30 кляновых дрэў. У 1934 г. вопыты прынялі вытворчы характар: трэстам Белхімлеса было падсочана 10.315 дрэў і здабыта 80.340 літраў соку; у 1935 г. здабыта 111.345 літраў, у 1936 г. — 90.050 літраў. У 1934 годзе была абсталявана ўстаноўка з 8 выпарацелямі (Асіпавіцкі лесгасрамгас) і атрымана 1.408 кг. сіропу, у 1935 г. — 1.570 кг. і ў 1936 г. — 1.364 кг. сіропу.

Аднак Белхімлес і Наркомгандаль з 1937 г. зусім спынілі вытворчасць гэтага высокакаштоўнага прадукта.

Магчымасці-ж здабычы кляновага сіропу ў нашай рэспубліцы даволі вялікія. Калі нават праводзіць падсочку клёну за год да яго рубкі, то і ў гэтым выпадку можна атрымаць даволі значную колькасць соку. Так, паводле даных упраўлення лесааховы, лесасечны фонд мае прыкладна 100—120 тыс. кляновых дрэў. Улічваючы, што падсочка клёна будзе праводзіцца выключна ў месцах яго найбольшай канцэнтрацыі, можна вызначыць колькасць дрэў для падсочкі ў 25—30 тыс. Кожнае дрэва можа даць 25—37 літраў соку за сезон. Такім чынам ад драўніны, паступаючай у рубку, можа быць здабыта да 837 тыс. літраў соку, што пры пераводзе ў сіроп складзе 12,7 тыс. кілограмаў. Гэтая колькасць значна павялічыцца пры ўмове падсочкі клёну за некалькі год да яго рубкі.

Невялікі вопыт трэста Белхімлеса ва ўмовах БССР пацвярджае гэта. Больш таго, па даных таго-ж Белхімлеса, сістэматычная падсочка кляновага дрэва выклікае павелічэнне колькасці цукру ў яго соку.

Трэба падкрэсліць, што абсталяванне гэтага промысла вельмі простае і не прадстаўляе ніякіх пяжкасцей. Шкляная банка, бураў, вядро і бочка — вось асноўныя віды абсталявання.

Значны процант цукру ўтрымлівае і сок бярозы. Бярозавы сок можа быць скарыстан для тых-жа мэт, што і кляновы. Гэта значна павялічыць сыравінную базу прамысловасці, асартымент прахладжальных напіткаў і сіропаў. Недарма лясныя работнікі, якія жывуць паблізу бярозавых насаджэнняў, запасаюцца бярозавым сокам на ўсё лета. Яны вырабляюць з яго хатні квас — вельмі прыемны, араматны напітак.

Вясной-жа бярозавым сокам, як напіткам, шырока карыстаецца сельскае насельніцтва. Магчымасці-ж здабычы бярозавага соку ў дзесяткі раз перавышаюць магчымасці здабычы кляновага соку, бо бярозавых дрэў у БССР вельмі многа.

Свердлоўская лесахімічная станцыя вырабіла з бярозавага соку 20 тыс. бутэлек віна. Гэтае віно не ўступае віноградным. Паводле даных той-жа лесахімічнай станцыі, з аднаго бярозавага дрэва можна атрымаць 0,5—0,6 літра моцнага віннага спірту.

Наркамлесу БССР і Упраўленню падсобнай гаспадаркі лесааховы неабходна неадкладна ажыццявіць канкрэтныя мерапрыемствы па здабычы кляновага і бярозавага соку.

Н. Е. КУНЕВІЧ.

Хуткая дапамога на самалёце

МАЗЫР. (Кар. «Звязды»). Жыццё Фядоры Чарнушэвіч — калгасніцы сельгаспрадпрыемства «Чырвоны Кастрычнік», Тураўскага раёна,—было ў небяспецы. Патрабавалася кваліфікаваная медыцынская дапамога.

Па выкліку Тураўскага раённага аддзела аховы здароўя, 16 снежня з горада Мінска на самалёце прыбыў у калгас асістэнт мінскай гінекалагічнай клінікі тав. Старавойтаў. Дзякуючы ўдала зробленай аперацыі тав. Чарнушэвіч была выратавана ад смерці.

Вучоныя запіскі мінскага педінстытута

Выйшлі з друку вучоныя запіскі кафедры мовы і літаратуры мінскага педагагічнага інстытута імені А. М. Горкага. Надрукавана 10 навуковых работ, у тым ліку работа дапэнта т. Барага «Лёс камедыі «Педарасль», артыкулы: кандыдата філасофскіх навук т. Карабана «Літаратурна-крытычныя погляды Пісарэва», кандыдата філалагічных навук т. Скалінай «Маякоўскі і літаратура пачатку XX стагоддзя» і інш.

(БЕЛТА).

НАВЕСЦІ ПАРАДАК У АЎТАГАСПАДАРЦЕ

У Мінскім гартопе многа нясправных машын. Яны стаяць пад адкрытым небам без догляду, іржавеюць. У пакрышкаўной з машын знойдзена 36 цвікоў. Рэдкі гараж не паклапаціліся іх выняць.

На дворе фабрыкі імені Кагановіча ніць машына, ад якой асталася толькі рама. Адміністрацыя не ведае, куды ці ўсе астатнія часткі.

Вялікі парк Паркамгаса ў хаатычным становішчы. У ім больш ста нясправных машын і ніхто не прымае мер да іх рамонту.

Многа падобных фактаў выявіла камісія Мінскага гаркома КП(б)Б, якая абследавала становішча аўтапарка ў г. Мінску.

Вынікі абследвання абмяркоўваліся нарадзе прадстаўнікоў паркаматаў і рэктараў прадпрыемстваў, скліканай комам КП(б)Б.

Нарада адзначыла, што становішча аўтапарка г. Мінска дрэннае, дагледжанасць неахайна. Наркамат аўтамабільнага транспарта не займаўся наладжваннем транспарта сталіцы, нават свае машыны не прывёў у парадак.

Прапанавана ўсім гаспадарнікам нясправныя машыны неадкладна адремонтаваць, пафарбаваць і захоўваць у дынках.

Даручана аўтаінспекцыі прыцягнуць к крымінальнай адказнасці асоб, якія бесгаспадарча адносяцца да аўтатранспарта.

Па раёнах горада склікаюцца нарады вадзіцеляў і работнікаў аўтагаспадаркі.

Каштоўная кніга

Дзяржаўнае выдавецтва палітычнай літаратуры (Масква) выдала на рускай мове зборнік «Беларусь у барацьбе супроць польскіх захватчыкаў у 1919—1920 гг».

У зборніку змешчаны ўспаміны ўдзельнікаў, калгаснікаў, былых чырвоных партызан і работнікаў большэвіцкага падполля Беларусі. У канцы кнігі надрукаваны архіўныя дакументы.

Кніга дапаможа нашаму чытачу адзначыць са становішчам беларускага народа пад уладай панскай Польшчы, гераічнай барацьбой прапоўных Беларусі пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі супроць белапалякаў.

Зборнік падрыхтавалі да друку навуковыя супрацоўнікі сакратарыята галоўнай рэдакцыі «Гісторыі грамадзянскай вайны» О. Шэкун, Р. Кроль і П. Трусава.

У падрыхтоўцы зборніка і ў літаратурнай апрацоўцы ўспамінаў прымалі ўдзел беларускія пісьменнікі: Змітрок Бядуля, Міхась Лынькоў, Макар Пасляловіч, Кузьма Чорны, Фядос Шыкліер.

Зборнік мае 190 старонак, дрэнна афармлен. Каштуе ён 8 рублёў.

Прэм'ера ў Першым беларускім драматычным тэатры

Учора Першы беларускі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычны тэатр паказаў сваю новую работу — пастаноўку камедыі Лопе дэ-Вега «Ці для другіх, разумная для сябе» (пастаноўшчык заслужаны артыст БССР В. Я. Галаўчынер, мастак Е. А. Коркіна, пазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Е. К. Цікоцкі).

У галоўных ролях з вялікім поспехам выступілі народны артыст БССР Г. П. Глебаў, заслужаныя артысты БССР К. Ф. Ніліч, С. С. Бірыла, О. В. Галіна, артысты С. М. Станюта, Б. Л. Алексеенка і інш.

Гледачы цёпла сустрэлі новы спектакль.

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ.

Дзяржаўны ордэна Леніна Вялікі тэатр оперы і балета БССР

20 снежня
РУСАЛКА
21/XII—Трыльбі
Пачатак у 8 г. 30 м. веч.
Рыхтуецца да пастаноўкі балет Дон-Кіхот

Першы Беларускі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычны тэатр

20 снежня
Прэм'ера
ДУРА ДЛЯ ІНШЫХ, РАЗУМНАЯ ДЛЯ СЯБЕ
Пачатак у 8 г. веч.

Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР
21 снежня
ПВЕЙ КУНІЛЕМЛЭХ
Пачатак у 8 г. 30 м. веч.
Бліжэйшая прэм'ера «Дос клейне ментшеле»

Кінатэатр «Чырвоная зорка»
ДЗЕНЬ НОВАГА СВЕТУ

Кінатэатр «Родина»
«ВОЗВРАЩЕНИЕ»

Кінатэатр «Інтэрнацыянал»
«Беспризорница»

Кінатэатр «Спартак»
ПЕРАХОД

У аддзел аб'яў звяніце па тэл. 21-399

ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ЛЕНІНА ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

ПРЭМ'ЕРА
ПІКАВАЯ ДАМА
Муз. Чайкоўскага.

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА
„ГЛАВКИНОПРОКАТ"
ХУТКА ВЫПУСКАЕ на экраны рэспублікі
НОВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
СІБІРАКІ
Аўтар сцэнарыя — А. ВІТЭНКОН.
Рэжысёр—засл. дзеяч мастацтваў — Л. КУЛЕШОЎ.
Аператар — М. КІРЫЛАЎ.
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:
Артыст — ордэнаносец М. ГЕЛАВАНІ.
Засл. арт. рэсп. Д. ОРЛОЎ.
Засл. арт. рэсп. А. ХАХЛОВА.
Засл. арт. рэсп. С. КАМАРОЎ.
Артысты: Д. САГАЛ, Т. АЛЬЦОВА, Г. МІЛЯР, А. ФАЙТ.
ВЫТВОРЧАСЦЬ КІНОСТУДЫІ «СОЮЗДЕТФИЛЬМ».

МІНСКІ ГАРТОП
просіць грамадзян горада,
маючых на руках
аплочаныя талоны на дровы,
з'явіцца 21, 22 і 23 снежня
на склады гартопа №№ 1, 2 і 4
ЗА АТРЫМАННЕМ ДРОЎ.
Мінгартоп.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ФІЛАРМОНІЯ
(памяшк. клуба імені Сталіна)

20 снежня.
КАНЦЭРТ
Лаўрэат усесаюзнага і міжнароднага конкурсаў музыкантаў-выканаўцаў
ордэнаносец
Ліза ГІЛЕЛЬС
(скрыпка)
Лаўрэат усесаюзнага і міжнароднага конкурсаў піяністаў
ордэнаносец
Роза ТАМАРКІНА
Пачатак у 9 гадзін вечара.
Білеты ў касе клуба з 2 г. дня да 9 г. веч. і ў касе папяраднага продажу білетаў (рог Ленінскай і Совецкай, магазін сантгіены).

АПТЭКАРСКУЮ ПАСУДУ
(СКЛЯНКІ І БАНКІ)
у чыста вымытым выглядзе
ПРЫМАЮЦЬ
у неабмежаванай колькасці
ЎСЕ АПТЭКІ гор. Мінска і раёна.
ГРАМАДЗЯНЕ!
НЕ ЗАГРАМАДЖАЙЦЕ сваіх памяшканняў непатрэбнай вам аптэчнай пасудай, не затрымлівайце яе ў сябе,
здавайце
Ў БЛІЖЭЙШУЮ ДА ВАС АПТЭКУ.
Ва ўсіх аптэках таксама ПРЫМАЮЦЦА БУТЭЛЬКІ з-пад БАРЖОМА і НАРЗАНА
МІНАБЛАПТЭКАЎПРАЎЛЕННЕ.

АД МІНСКАГА АБЛАСНОГА ФІНАНСАВАГА АДДЗЕЛА

аб парадку і тэрмінах выбаркі рэгістрацыйных пасведчанняў на права займацца саматужнымі і рамесніцкімі промысламі на 1941 год

У адпаведнасці з правіламі рэгістрацыі саматужных і рамесніцкіх промыслаў, зацверджаных пастановай СНК Саюза ССР ад 26 сакавіка 1936 г. № 562, Мінскі абласны фінансавы аддзел АБ'ЯЎЛЯЕ:

1. Усе асобы, якія займаюцца саматужнымі і рамесніцкімі промысламі і абслугоўваннем асабістых і гаспадарча-бытавых патрэб насельніцтва, абавязаны да 1 студзеня 1941 года выбраць на свае промыслы рэгістрацыйныя пасведчанні на 1941 год у гарадскім або раённым фінансавым аддзеле па месцу знаходжання промысла.

У выпадку, калі промысел пачынаецца ў сярэдзіне года, рэгістрацыйнае пасведчанне павінна быць выбрана да пачатку адкрыцця промысла.

Саматужнікі і рамеснікі, якія займаюцца перасовачнымі промысламі, павінны выбраць рэгістрацыйныя пасведчанні ў фінансавым аддзеле па месцу пастаяннага жыхарства.

2. Рэгістрацыйныя пасведчанні па свае промыслы павінны таксама выбраць члены прамыслова-кааператыўных арцелей і арцелей кааперацыі інвалідаў, якія працуюць апрача арцелей на старану, рабочыя і служачыя, якія займаюцца на даму саматужнымі і рамесніцкімі промысламі па рабоце непасрэдна на заказчыка.

3. Для атрымання рэгістрацыйных пасведчанняў, саматужнікі і рамеснікі абавязаны падаць заяву ў гарадскі або раённы фінансавы аддзел па месцу знаходжання промысла, прадставіць фотакартку і марак дзяржаўнай пошліны на суму 10 руб., а таксама прад'явіць пашпарт.

4. Рэгістрацыйнае пасведчанне выдаецца фінансавым аддзелам тэрмінам да канца календарнага года і сапраўдна толькі па той промысел, на які яно выдана.

Пры спыненні промысла ў сярэдзіне года саматужнік абавязан звярнуць атрыманае на промысел рэгістрацыйнае пасведчанне ў фінансавы аддзел па месцу выдачы.

Промысел лічыцца спыніўшымся з моманту звароту рэгістрацыйнага пасведчання.

5. Асобы, нарушыўшыя правілы рэгістрацыі промыслаў, падвяргаюцца штрафу ў размеры да 500 руб.

МІНСКІ АБЛАСНЫ ФІНАНСАВЫ АДДЗЕЛ.

Праграма радыёперадач

Станцыя РВ-10

22 СНЕЖНЯ. НЯДЗЕЛЯ

00.07—Эстрадны канцэрт і музыка для танцаў. 10.00—Канцэрт для дзяцей з твораў рускіх кампазітараў. 10.30—Лекцыя дацэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта тав. Сагаловіча. Тэма: «Ці быў пачатак і ці будзе канец свету». 11.00—Выступленне мастакоў самадзейнасці г. Мінска. 11.30—вучоным ля мікрафона. Даклад заслужанага дзеяча навукі прафесара Шэрашэўскага аб старасці і прадаўжэнні жыцця. 12.15—Канцэрт для палярнікоў. 13.15—Міжнародны агляд. 16.05—Эстрадны канцэрт. 17.05—Інфармацыі. 17.15—Перадача для піонераў і школьнікаў «Піонер Пятроў Марозаў». 18.00—Канцэрт пры ўдзеле артыстаў операнага тэатра. 19.15—Канцэрт па заяўках радыёслухачоў. 19.45—Гутарка. «Рэвакцыйная сутнасць рэлігійнага свята — калядз». 20.30—Канцэрт. 21.05—Папулярны канцэрт.

23 СНЕЖНЯ. ПАНЯДЗЕЛАК

00.07—Мантаж оперы Ніколаі «Віндзорскія праказніцы». 11.00—Лекцыя з дапамогу вывучаючым марксізм-ленінізм. «Філасофія феадальнага грамадства». 17.05—Перадача для піонераў і старшых школьнікаў. Тургенеў—«Біруک». 18.00—Канцэрт з твораў Рымскага-Корсакова. 18.15—Канцэрт беларускай народнай музыкі. 19.30—Урыўкі з оперы Пуччіні «Тоска». — «Як гартавалася сталь». 20.05—Лекцыя: «Іскра» ў барацьбе за аб'яднаўленне ленінскага плана пабудовы марксісцкай партыі». 21.05—Літаратурная перадача. Вальфсон — «У матрасным магіле». 21.35—Творчы канцэрт заслужанага дзеяча мастацтваў—ордэнаноснага Залатарова: сімфонія, чырвонаармейская сюіта.

24 СНЕЖНЯ. АЎТОРАК

00.07—Канцэрт папулярнай музыкі. 10.00—Перадача для дзяцей з цыкла «Жыццё школы». 10.10—Перадача для малодшых школьнікаў. Н. Остроўскі «Гудок». 17.05—Перадача для піонераў і старшых школьнікаў. Жытковіч «Піхцін Матвеевіч». 17.30—Вершы паэта Твардоўскага. Пракофьева і Ісакоўскага. 18.15—Канцэрт рускай народнай песні і танца. 19.30—Артыкул «За дзейсную палітычную агітацыю». 19.45—Камерны канцэрт з твораў Александрава. 20.15—Лекцыя ў дапамогу вывучаючым марксізм-ленінізм: «Філасофія Адраджэння». 21.05—Канцэрт беларускага мастацтва. 22.00—Трансляцыя канцэрта з Ростова-на-Дану. 22.40—Трансляцыя канцэрта з Кіева.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Совецкая, 49. Тэлефоны рэдакцыі: адказны рэдактар — 20-000 (камутатар) дадатковы — 102, прыёмная рэдактара — 2-13-52. Намеснік адказнага рэдактара — 2-51-88. Адказнага сакратара — 2-13-53. Намеснік адказнага сакратара — 2-24-12. Сакратарыята — 2-39-55. Аддзелаў: заг. партыйнага аддзела — 2-18-46. Літработнікаў — 2-13-56. Заг. аддзела прапаганды і агітацыі — 2-51-89. Заг. эканамічнага аддзела — 2-08-30. Літработнікаў — 2-15-56. Літработнікаў па літаратуры і мастацтву, школах, ваенна-фізкультурнай рабоце — 2-19-85. Унутранай інфармацыі — 2-13-60. Аддзела рабселькораў і пісем прапоўных — 2-08-44 і 2-18-45. Заг. выдавецтва — 2-13-58. Бухгалтэрыі выдавецтва і аддзела аб'яў — 2-13-99. Выпускаючага — 2-47-68. Карэктарскай—2-13-57.

У4960. Мінск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. Кр., Ш., Ш.